**Як абараніць сэрца?**

СТАР. 5

**Для каго ўзышла «Зара»**

СТАР. 6

**«Экспра-прыятар» у Бабруйску**

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

# ЗВЯЗДА

24 ЖНІЎНЯ 2016 г. СЕРАДА № 162 (28272)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Сітуацыя кантралюецца

## Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прымаў з дакладамі вышэйшых службовых асоб краіны

**На сустрэчы кіраўніка дзяржавы з прэм'ер-міністрам Андрэем Кабяковым і старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Паўлам Калаурам абмяркоўвалася сітуацыя ў эканоміцы краіны. Кіраўніку дзяржавы далажылі аб выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця за мінулы перыяд 2016 года.**

Абмяркоўвалася таксама супрацоўніцтва Беларусі з міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі па канкрэтных пытаннях. У іх ліку праект па рэканструкцыі аўтадарогі Мінск—Гродна, які рэалізуецца сумесна з Сусветным банкам. «Трэба ўсё рабіць, каб гэта супрацоўніцтва не спынялася. Для нас гэта вельмі выгаднае супрацоўніцтва, асабліва ў гэты перыяд», — адзначыў Прэзідэнт.

Андрэй Кабякоў далажыў, што ў той матрыцы задач, якая была вызначана кіраўніком дзяржавы, з сямі паказчыкаў выкананы адзін, але вельмі важны. Гэта паказчык інфляцыі. Ва ўрадзе разлічваюць, што інфляцыю ў 2016 годзе, як і планавалася, удасца ўтрымаць у межах 12%.

Эканоміка краіны паступова вяртаецца на траекторыю аднаўлення эканамічнага росту. Па пераважнай большасці паказчыкаў маецца станоўчая дынаміка, якая характарызуе якасныя змены ў эканоміцы.

Прэзідэнт падрабязна праінфармаваны аб сітуацыі на знешніх рынках, суадносінах экспарту і імпарту, плацежным балансе краіны. Абмеркаваны праблемныя пытанні, якія тычацца функцыянавання дзяржпрадпрыемстваў. Разгледжана выкананне праграмных мер па скарачэнні пракрыжаванага субсідавання ў сферы ЖКГ.

Акрамя таго, старшыня праўлення Нацыянальнага банка Павел Калаур далажыў кіраўніку дзяржавы аб сітуацыі на валютным рынку і ў банкаўскім сектары. Нягледзячы на зніжэнне экспарту ў вартасным выражэнні, урад і Нацбанк разам з банкаўскай сістэмай прынялі адпаведныя меры, якія дазволілі істотным чынам стабілізаваць сітуацыю на валютным рынку.

Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз звярнуў увагу ўрада і Нацбанка, а таксама іншых банкаў на неабходнасць прыкласці адпаведныя намаганні для захавання належнай рэсурснай падтрымкі непасрэдна для крэдытавання рэальнага сектара эканомікі.

Прэзідэнт таксама падтрымаў прапанову ўрада аб увядзенні з 1 кастрычніка безнаяўных жыллёвых субсідый для частковай кампенсацыі платы за жыллёва-камунальныя паслугі, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Праект адпаведнага ўказа быў прадстаўлены Аляксандру Лукашэнку. Разлічваць на падтрымку змогуць сем'і, дзе аплата жыллёва-камунальных паслуг будзе перавышаць устаноўлены працэнт ад сукупнага даходу. Для гараджан гэта выдаткі больш за 20% у сукупным даходзе, а для сельскай мясцовасці — 15%, растлумачыў Андрэй Кабякоў.

У цэлым Прэзідэнт патрабуе, каб урад, плануючы нейкія рашэнні, якія могуць паўплываць на жыццёвы ўзровень насельніцтва, адрасным чынам у дачыненні да канкрэтных катэгорый грамадзян прадугледжваў нівелюючыя меры, дзейнічаў у рамках канцэпцыі сацыяльнай дзяржавы.

* * *

Аляксандр Лукашэнка заслухаў таксама даклад генеральнага пракурора Аляксандра Канюка аб стане крымінагеннай сітуацыі і рабоце органаў пракуратуры.

На мерапрыемстве таксама прысутнічалі прадстаўнікі іншых сілавых структур, кіраўніцтва Адміністрацыі Прэзідэнта і дзяржсакратарыята Савета бяспекі.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, пашыраны фармат мерапрыемства звязаны з глыбокай рэформай у праваахоўнай сістэме, якая нядаўна адбылася ў Беларусі. Як было адзначана па выніках даклада, у дзейнасці пракуратуры маецца тэндэнцыя ўсё большага пераходу пракурорскага нагляду ў эканамічную сферу. Прэзідэнт у цэлым станоўча ацаніў стан спраў у органах пракуратуры. Разам з тым, даручана ліквідаваць асобныя недахопы.

Абмеркаваны і некаторыя кадравыя пытанні, падрыхтоўка да правядзення ў Мінску ў пачатку верасня каардынацыйнай нарады генеральных пракуратураў краін СНД.

Што тычыцца крымінагеннай сітуацыі, то ў параўнанні з мінулым годам яна практычна не змянілася. Разам з тым, у якасці станоўчага моманту адзначаецца меншая колькасць забойстваў. І ў цэлым у апошнія гады мае месца тэндэнцыя скарачэння злачыннасці.

ХХIII ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА
РАГАЧОЎ 2016

# Прыемныя клопаты

## ПАДРЫХТОЎКА ДА СВЯТА НА ФІНІШНАЙ ПРАМОЙ

Майстар-страхар Аляксандр ЛАТУШКА — жыхар сталіцы, працуе на ўзвядзенні даху царкоўнапрыходскай школы праваслаўнага храма Аляксандра Неўскага ў Рагачове.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рагачоў сёння не пазнаць. Ён падобны на вялізны мурашнік. Здаецца, што літаральна ўсе жыхары выйшлі на вуліцы, каб аднавіць райцэнтр да Дня беларускага пісьменства. Тут ужо шмат зроблена: абноўлены важныя сацыяльныя і культурныя аб'екты. Горад змяняецца на вачах, гавораць нават тыя, хто тыдзень не быў у Рагачове. Штодзень вядуцца будаўніча-мантажныя работы на аўтамагістралях, ідзе рамонт дарожнага пакрыцця вуліц. Ужо добраўпарадкаваны вадаём на скрыжаванні вуліц Кірава і Бабруйскай, тэрыторыя парку, праведзены капітальны рамонт фасадаў многіх дамоў, будынкі пошты, рэдакцыі раённай газеты... Гатоўнасць горада да свята ацэньваецца на 90%. СТАР. 2

*ЦЫТАТА ДНЯ*

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Паколькі ўласных сродкаў у прадпрыемстваў недастаткова, сродкі і магчымасці бюджэту вельмі абмежаваныя, крэдытныя рэсурсы абмежаваныя і дарагія, таму выхад бачыцца ў прамых замежных інвестыцыях. Гэта ключавое пытанне развіцця эканомікі. На жаль, у нас мала практычнага руху па гэтым пытанні. Усе разважаем, гаворым правільна, а калі паглядзець, то інвестыцыі ў асноўны капітал за шэсць месяцаў бягучага года скараціліся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Доля замежных інвестыцый — усяго 4,9 працэнта. Неабходна прымаць меры для выпраўлення існуючай сітуацыі і актывізацыі інвестыцыйнай дзейнасці».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | | 1,9421 ▲ |
| Еўра | | 2,2030 ▲ |
| Рас. руб. | | 0,0299 ▼ |
| Укр. грыўня | | 0,0767 ▲ |

■ Жніво-2016

# Зямлю не падманеш

## Чаму формула «Больш пасеем — больш пажнём» спрацоўвае не заўсёды

**Навукоўцы і аграрыі ў адзін голас адзначаюць, што спрачацца са зменлівым надвор'ем з года ў год становіцца ўсё больш складана. Але ў бітве за ўраджай ні тыя, ні іншыя не хочуць здаваць пазіцыі. Пра гэта сведчаць і вынікі ўборачнай кампаніі, якая сёння практычна падышла да свайго лагічнага завяршэння. Нягледзячы на засуху, пылавыя буры і нераўнамернае размеркаванне ападкаў, сёлета, паводле папярэдніх вынікаў, удалося сабраць каля 7 млн тон збожжавых і зернебабовых культур. Разам з тым гэты паказчык прыкметна ніжэйшы за ўзровень мінулага года, калі валавы збор збожжа склаў больш за 8,5 млн тон. Падрабязней аб ходзе і выніках уборачнай кампаніі і пра тое, як селекцыя змагаецца з кліматычнымі зменамі, карэспандэнту «Звязды» расказаў доктар сельскагаспадарчых навук, генеральны дырэктар Навукова-практычнага цэнтра па земляробстве Нацыянальнай акадэміі навук Фёдар ПРЫВАЛАЎ.**

***— Фёдар Іванавіч, з пункту гледжання аграрнай навукі, як вы ацэньваеце сёлетнюю ўборачную кампанію?***

— Вучоныя навукова-практычнага цэнтра па земляробстве яшчэ 1 ліпеня 2016 года рабілі прагноз датычна ўборачнай кампаніі. Наведаўшы гаспадаркі ўсіх абласцей краіны, мы прыйшлі да высновы, што ўраджай збожжа складзе прыблізна 7,1 млн тон. Як відаць, ён сёння практычна выкананы. На вынікі ўборачнай кампаніі негатыўна паўплываў шэраг фактараў, да якіх можна аднесці меншае выкарыстанне азотных і іншых угнаенняў, а таксама меншае прымяненне сродкаў аховы раслін. Капрызы надвор'я таксама адыгралі сваю ролю.

Цяжкасці з угнаеннямі сёння відавочныя — крызіс сусветнай эканомікі адмоўна ўплывае на сітуацыю ў Беларусі: гаспадаркі атрымлівалі менш крэдытных рэсурсаў. СТАР. 3

■ Жыллё

# ПОШУК СТАБІЛЬНАГА «КВАДРАТА»

## Эксперты сталічнага рынку арэнды прагназуюць захаванне сённяшніх цэннікаў мінімум да пачатку зімы. Праўда, яны адзначаюць, што з сярэдзіны ліпеня арэнда ўжо падаражэла на 5-9%

**Звычайна з сярэдзіны ліпеня і да другой дэкады верасня ў Мінску назіраўся павышаны попыт на здымныя кватэры. Аднак у апошнія некалькі гадоў падобная тэндэнцыя ўжо не працавала, бо ў сектары прыватнай арэнды існавала максімальная колькасць варыянтаў свабодных кватэр, якія наш рынак «пераварыць» ужо не мог. У гэты час цэны на здымнае жыллё ў валютным эквіваленце выключна зніжаліся. Пакуль зніжаліся. Летам сёлета стаўкі прыватнай арэнды нават крыху падраслі і з сярэдзіны жніўня цалкам стабілізаваліся. Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку арэнды і прагнозы на найбліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» расказала начальнік аддзела арэнды кампаніі «Твая сталіца. Агенцтва нерухомасці» Маргарыта ПАЧЫЦКАЯ.** СТАР. 3

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Сарказі зноў збіраецца ісці на выбары

Экс-прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі мае намер вылучыць сваю кандыдатуру на бліжэйшых прэзідэнцкіх выбарах у гэтай краіне, паведамляюць інфармагенцтвы. Такімі планамі Сарказі падзяліўся ў новай кнізе «Усё для Францыі», урыўкі з якой аўтар апублікаваў на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы Facebook. Ён канкрэтызуе, што вырашыў стаць кандыдатам у прэзідэнты Францыі на выбарах 2017 года. Адзін з былых кіраўнікоў Пятай рэспублікі адзначыў, што адчувае ў сабе сілы весці перадвыбарную барацьбу ў складаны для Францыі гістарычны перыяд.

### Колькасць ахвяр выбуху на вяселлі ў Турцыі павялічылася да 54 чалавек

Колькасць загінулых у тэрарыстычнай атацы, якая адбылася 20 жніўня падчас вясельнай цырымоніі на поўдні Турцыі, павялічылася да 54 чалавек. Раней паведамлялася пра 51 загінулага. Паводле слоў ананімнай крыніцы, яшчэ тры чалавекі памерлі ад атрыманых ран у шпіталі. Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган паведаміў, што да выбуху мае дачыненне тэрарыст-смяротнік ва ўзросце 12-14 гадоў. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў глыбокія спачуванні свайму турэцкаму калегу Рэджэпу Таіпу Эрдагану.

### Суд адмовіў расійскім паралімпійцам ва ўдзеле ў Гульнях-2016

Спартыўны арбітражны суд адхіліў іск Паралімпійскага камітэта Расіі (ПКР) і не дапусціў расійскіх спартсменаў да Гульняў-2016 у Рыа-дэ-Жанэйра. У судзе прызналі законным рашэнне кіраўніка Міжнароднага паралімпійскага камітэта Філіпа Крэйвена аб прыпыненні членства ПКР у арганізацыі і нядопуск зборнай Расіі да Паралімпійскіх гульняў. Такім чынам, расійская каманда ў поўным складзе не зможа прыняць удзел у спаборніцтвах. Паралімпійскія гульні 2016 года пройдуць у Рыа-дэ-Жанэйра з 7 па 18 верасня.

ISSN 1990 - 763X

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Венгерскі дэпутат прапанаваў адпуджваць мігрантаў свінымі галовамі



Паплечнік прэм'-ер-міністра Венгрыі і еўрадэпутат Дзьёрдзь Шофлін прапанаваў зусім незвычайнае рашэнне праблемы бежанцаў. Як паведамляюць СМІ са спасылкай на The Independent, ён заявіў, што абмежаваць паток бежанцаў у еўрапейскія краіны можна шляхам развешвання на межах свіных галоў, якія будуць адпуджваць мігрантаў-мусульман. На сваёй старонцы ў Twitter ён размясціў запіс, дзе расказаў, што галава свінні будзе стрымліваць значна больш эфектыўна, чым малюнкі чалавека. Паведамляецца таксама, што гэты запіс ужо выдалены, бо палітыка падверглі жорсткай крытыцы, назваўшы яго заяву неанацысцкай і агіднай. Варта адзначыць, што аўтар нашумелай прапановы адмовіўся прасіць прабачэння за свае словы, патлумачыўшы гэта тым, што ён нікога не зневажаў. Нагадаем, што ў кастрычніку ў краіне пройдзе рэферэндум, на якім жыхары павінны будуць выказаць сваю згоду ці нязгоду з палітыкай ЕС па абавязковым рассяленні бежанцаў.

## КОРАТКА

Замежнікам для наведвання Аўгустоўскага канала ўстанаўліваецца бязвізавы ўезд у Беларусь. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 23 жніўня.

**Вадзіцелі ў Беларусі павінны будуць днём ездзіць з блізкім святлом фар з 25 жніўня па 5 верасня.**

Падраздзяленні Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ) будуць задзейнічаны ў міратворчых місіях ААН.

**Беларуская група «Дразды» дасць дабрачынны канцэрт на глыбіні 420 м пад зямлёй. Канцэрт «У глыбіні калійных руд» адбудзецца 27 жніўня ў салігорскіх шахтах, а атрыманыя ад незвычайнага выступлення грошы будуць накіраваны на дапамогу дзецям.**

Прыпынак аўтобусаў № 31 і № 172Э каля станцыі метро «Уручча» ў Мінску ў напрамку пасёлка Калодзішчы з 24 жніўня пераносіцца на пляцоўку для прыгарадных маршрутаў каля станцыі метро «Уручча».

■ Рэпартаж-эксперымент

# Шасцікласнікі выбіраюць макасіны

## Наколькі густы і патрэбы дзяцей супадаюць з густамі і магчымасцямі бацькоў

**Сабраць дзіця ў школу — гэта хоць і прыемны, але ўсё ж такі стрэс для бацькоў. А калі сям'я шматдзетная, то апошнія тыдні жніўня нагадваюць спрынтарскі забег: трэба і фінансава паднапружыцца, і намаганняў прыкласці мноства, каб абавязкова дагадзіць кожнаму. Разам з сям'ёй Куноўскіх карэспандэнты «Звязды» адправіліся па пакупкі ў адзін з самых буйных сталічных універмагаў — ГУМ.**

Выбар бацькоў.

Выбар Міхася.

Фота Надзеі БУЖАН.

У Дзмітрыя і Галіны Куноўскіх трое дзяцей: пятнаццацігадовая Ганна (10 клас), адзінаццацігадовы Міхаіл (6 клас) і чатырохгадовая Ксенія. СТАР. 4

■ Парламенцкі дзённік

# ЛЕКІ БУДЗЕМ РАБІЦЬ РАЗАМ З ІНДЫЯЙ

**У сталічнай прамзоне Калядзічы неўзабаве разгорнецца вялізная будоўля. Там з'явіцца сумесны беларуска-індыйскі фармацэўтычны завод. Маштаб будучай вытворчасці ўражвае: запланавана пабудаваць тры вытворчыя корпусы і лагістычны цэнтр. На заводзе будуць выпускаць антырэтравірусныя і супрацьпухлінныя лекі, якія цяпер краіна завозіць з-за мяжы. Урачыстая цырымонія закладкі капсулы ў падмурак будучага прадпрыемства адбылася ўчора.**

— Падчас візіту прэзідэнта Індыі ў Беларусь кіраўнікі нашых дзяржаў дамовіліся аб стварэнні дарожнай карты, якая мусіць не толькі актывізаваць супрацоўніцтва, але і перавесці яго з таварнай фазы ў інвестыцыйную, — сказаў **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** — І вось аб'ектам для інвестыцый стала фармацэўтыка. Тым больш што Індыя славіцца ў свеце сваімі кампаніямі, якія выпускаюць і субстанцыі, і гатовыя лекі. Завод будзе будавацца пры падтрымцы як айчынных, так і індыйскіх вытворчасцяў. Агулам жа па краіне ў найбліжэйшыя 3 гады з удзелам вытворцаў з гэтай краіны будуць узведзены сама менш тры заводы.

Зараз кошт лекаў для аднаго курса лячэння ад гепатыту С складае некалькі тысяч долараў. Прэпараты, якія будуць выпускацца ў Калядзічах, будуць прыкметна таннейшыя. А гэта значыць, што лячэнне стане больш даступным. Мяркуецца, што пасля запуску завода Беларусь здолее сэканоміць на закупках лекаў супраць анкалагічных захворванняў, СНІД і гепатыту С сама меней 3 мільёны долараў.

— Гэта першы прыклад сумеснага прадпрыемства фармацэўтычнай вытворчасці, — зазначыў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Індыі ў Рэспубліцы Беларусь спадар Саксена ПАНКАДЖ.** — Ён адчыняе дзверы індыйскаму бізнесу для інвестыцый у Беларусь і ў іншых галінах эканомікі. Усё гэта адбываецца дзякуючы сумеснай рабоце двух урадаў. Варта адзначыць, што лекі, зробленыя на гэтым прадпрыемстве, будуць пастаўляцца не толькі на ўнутраны рынак, але і ў краіны ЕАЭС.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■

■ Выбары-2016

Лідзія ЯРМОШЫНА:

# «АГІТАЦЫЯ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД САМІХ КАНДЫДАТАЎ, АДПАВЕДНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ІМ ПРАДАСТАЎЛЕНЫ»

**Адным з галоўных пытанняў учарашняга пасяджэння Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў была рэгістрацыя кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі. Па словах Лідзіі ЯРМОШЫНАЙ, старшыні Цэнтральнай камісіі, дакументы аб вылучэнні прадставілі ўсе рэгіёны.**

## Або ўрад — або парламент

— Вылучэнне адбылося ў адпаведнасці з законам, усе кандыдатуры адпавядаюць тым патрабаванням, што прад'яўляюцца, — заявіла Лідзія Ярмошына.

Яна звярнула ўвагу, што адным з вылучаных кандыдатаў з'яўляецца член урада — міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна. У гэтым выпадку, па словах старшыні Цэнтральнай камісіі, ёсць пэўныя перашкоды. Згодна з выбарчым заканадаўствам нашай краіны, члены ўрада не могуць увахо-дзіць у Савет Рэспублікі.

— Яны абавязваюцца ў выпадку абрання пакінуць свае паўнамоцтвы ва ўрадзе. Падобнае абавязацельства Марыяна Шчоткіна прадставіла, — падкрэсліла Лідзія Ярмошына.

На пасяджэнні Цэнтрвыбаркама быў прыняты праект пастановы аб рэгістрацыі вылучаных кандыдатаў у члены верхняй палаты.

## Інваліды змогуць галасаваць па сваім пасведчанні

Адным з пытанняў парадку дня на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі стала ўжо традыцыйнае — стварэнне безбар'ернага асяроддзя. У зале знаходзіліся кіраўнікі і члены грамадскіх арганізацый, што аб'ядноўваюць інвалідаў — яны, дарэчы, актыўна заявілі пра сябе і выступілі з шэрагам прапаноў. Так, цяпер атрымаць бланк для галасавання можна не толькі па такіх дакументах, як пашпарт, службовае, вадзіцельскае або пенсійнае пасведчанне, ваенны або студэнцкі білет, але і па пасведчанні інваліда.

Што да стварэння безбар'ернага асяроддзя ў рэгіёнах, то, па словах Лідзіі Ярмошынай, адпаведны працэс ідзе марудна:

— Такая развітая еўрапейская краіна, як Беларусь, увогуле павінна вырашыць гэтае пытанне не толькі ў тым, што мае дачыненне да выбараў, а ўсюды.

## З дыстанцыі сыходзяць кандыдаты-дублёры?

Як і прагназавалася, некаторыя кандыдаты — іх 21 — адмовіліся ад удзелу ў выбарах. Як паведаміла старшыня Цэнтральнай камісіі, кандыдаты не паведамляюць пра тое, што стала прычынай іх рашэння.

— Гэта іх права, — адзначыла Лідзія Ярмошына. — Мы нікога не абавязваем тлумачыць камісіі сваё рашэнне. Не выключаецца, што гэта былі кандыдаты-дублёры, якія з самага пачатку проста ішлі ў звязцы з больш моцным кандыдатам. У гэтым плане яны проста прыпыняць сваю кампанію для таго, каб галасы не рассейваліся і будуць працаваць на больш моцнага кандыдата. Гэта, я думаю, выбарчая тэхналогія, а не нейкія рэальныя прычыны, што ўплываюць на неўдзел у выбарах.

Нагадаем, першапачаткова для ўдзелу ў парламенцкіх выбарах быў зарэгістраваны 521 кандыдат, зняўся 21. Пры гэтым яшчэ аднаго аднавіла магілёўская камісія пасля падачы ім адпаведнай скаргі, траіх — суд. Такім чынам, у цяперашні час можна казаць пра 504 кандыдатаў у дэпутаты.

Старшыня Цэнтрвыбаркама праінфармавала, што на самі выбары ў нашу краіну прыедуць члены камісій, супрацоўнікі апаратаў краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Грузіі.

— Таксама ў нас будзе вялікая дэлегацыя ад ЦВК Карэі і дэлегацыя ад Сусветнай асацыяцыі арганізатараў выбараў, іх штаб-кватэра таксама знаходзіцца ў Сеуле, — дадала Лідзія Ярмошына.

## Выбары становяцца больш цывілізаванымі

Кандыдаты не вельмі актыўна карыстаюцца магчымасцю заявіць пра сябе на стэндах. На думку старшыні Цэнтральнай камісіі, прычына гэтага ў адсутнасці сродкаў:

— Відавочна, кандыдаты не стварылі асабістыя фінансавыя фонды, не вырабілі друкаваныя матэрыялы, таму ім няма чаго размяшчаць. Гэта ўсё залежыць ад волі самога кандыдата, адпаведныя магчымасці ім прадастаўлены. Цалкам магчыма, што многія не гатовы ўдзельнічаць у выбарах сур'ёзна, не спадзяюцца на перамогу і таму вырашылі не ўкладваць асабістыя сродкі ў вядзенне перадвыбарнай агітацыі.

Адказваючы на пытанне журналіста, што раздражняе і што натхняе ў бягучай выбарчай кампаніі, Лідзія Ярмошына прызналася, што яе нічога не раздражняе.

— Як я магу раздражняцца з-за таго, што з'яўляецца часткай майго жыцця? — адказала пытаннем на пытанне Лідзія Міхайлаўна. — Гэта жыццё, гэта людзі, гэта кандыдаты... Няма ніякіх праблем. Што да натхнення, думаю, што мы ўсё-такі праводзім выбары ўсё больш дасканала. Па меншай меры яны становяцца ўсё больш цывілізаванымі. Гэта і пэўная ветлівасць, цярпімасць да чужога іншадумства. Больш за ўсё мяне парадавалі нашы мясцовыя ўлады, якія нарэшце пачалі працаваць цывілізавана, адводзячы дастатковую колькасць месцаў для правядзення спачатку пікетаў па зборы подпісаў, а потым — перадвыбарных мерапрыемстваў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■

■ ПРАМАЯ ЛІНІЯ

# Сацыяльныя паслугі: што гарантуе дзяржава?



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Якія віды паслуг можна атрымаць у тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання і хто мае права на іх атрыманне? Куды звярнуцца ў выпадку цяжкай жыццёвай сітуацыі? На якія формы сацыяльнага абслугоўвання варта звярнуць увагу пенсіянерам? На гэтыя і іншыя вашы пытанні адказала падчас «прамой лініі», што адбылася ўчора ў рэдакцыі «Звязды», галоўны спецыяліст аддзела адраснай сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна ТАЛАЛАЕВА.**

За адну хвіліну да назначанага часу раздаецца тэлефонны званок.

***— Добры дзень! Гэта Быхавец Людміла Аркадзьеўна вас турбуе, са Смаргоні. Скажыце, калі ласка, раней адзінокім пенсіянерам аказвалі дапамогу ў рамонце — па замене сантэхнікі, электраправодкі і г.д. Тады дзейнічала сацыяльная праграма на 2011—2016 гады. А ці будзе прадугледжана такая дапамога ў наступнай сацыяльнай праграме?***

— Так, у адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва на 2016—2020 гады прадугледжана правядзенне рамонту жылых памяшканняў, якія належаць інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, інвалідам баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў і іншым катэгорыям грамадзян на ўмовах, якія вызначаюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

***— Дзякуй за адказ! У мяне ёсць яшчэ пытанне: у нас летась у сацыяльным цэнтры знялі платныя паслугі. Раней многія пенсіянеры імі карысталіся: ім касілі траву, рамантавалі платы, прывозілі дровы... Чаму гэтыя паслугі знялі? Попыт на іх вялікі...***

— Такія паслугі не ўваходзяць у пералік гарантаваных дзяржавай паслуг у сферы сацыяльнага абслугоўвання, іх прадастаўленне адносіцца да пазабюджэтнай дзейнасці тэрытарыяльных цэнтраў. Тут рашэнне прымаецца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі. Таму ўсе пытанні па аказанні гэтых паслуг вы павінны вырашаць на месцы. Вам трэба звярнуцца альбо ў свой райвыканкам, альбо наўпрост у Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага аблвыканкама, каб яны ўдакладнілі гэтую сітуацыю.

***— І яшчэ такі момант: я зусім адзінокая, маю двухпакаёвую кватэру. Пасля смерці мне няма каму яе адпісваць. Ці будзе пастанова Савета Міністраў аб пажыццёвым утрыманні за кватэру, якое дзейнічае цяпер у Мінску, распаўсюджана на краіну?***

— Работа над праектам адпаведнай пастановы вядзецца, і ў ім прадугледжваецца распаўсюджванне сацыяльных паслуг на падставе рэнтавых адносін на ўсю краіну.

*(Працяг «прамой лініі» чытайце ў наступных нумарах «Звязды».)*

# ДАКЛАДНЫ КУРС

## У Віцебску дадзены старт праекту па будаўніцтве сацыяльнага жылля з прыцягненнем кітайскіх інвестыцый

**Учора тут адбылася ўрачыстая цырымонія закладкі каменя пачатку будаўніцтва першага ў нашай краіне сацыяльнага жылога дома, які будзе ўзводзіцца беларускімі будаўнікамі з айчынных матэрыялаў з выкарыстаннем бязвыплатнай кітайскай дапамогі.**

Новабудоўля ў 10 паверхаў на 120 кватэр закладзена ў мікрараёне Білева-3. У цэлым у Беларусі плануецца ўзвесці цэлую серыю сацыяльных дамоў з прыцягненнем тэхніка-эканамічнай дапамогі КНР. Пачатку рэалізацыі маштабнага сацыяльнага праекта папярэднічала значная падрыхтоўчая работа органаў дзяржкіравання дзвюх краін. Сумеснае будаўніцтва сацыяльнага жылля стане яшчэ адной вяхой у развіцці дружбы Беларусі і Кітая.

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Цуй ЦЫМІН**, які прыняў удзел у мерапрыемстве, адзначыў, што Беларусь і Кітай цвёрда ідуць па курсе паглыблення адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства. Ён сказаў, што народы Кітая і Беларусі звязвае шчырае сяброўства. «На працягу 24 гадоў з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін наша супрацоўніцтва развіваецца дынамічна і ўстойліва. Зараз мы цвёрда ідзём па курсе, які вызначылі нашы нацыянальныя лідары. Гэта — паглыбленне адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства. Важна, што адносіны развіваюцца на прынцыпах узаемнай павагі, узаемнай выгады і роўнасці. Мы вучымся адзін у аднаго, дапамагаем і падтрымліваем адзін аднаго. Сённяшняе мерапрыемства — доказ шчырых, добрых, сяброўскіх пачуццяў кітайскага народа да беларусаў. Гэтая дапамога невялікая, але шчырая», — сказаў Цуй Цымін.

Пасол Кітая і намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Белавус пакінулі свае аўтографы на першым блоку падмурка будучага дома.

**Сяргей ХАРКАВЕЦ.**

■ Выбары-2016: меркаванне назіральнікаў

# «БЫЛІ СТВОРАНЫ РОЎНЫЯ ПРАВАВЫЯ ЎМОВЫ»

**Вольга КРЭМСКАЯ, доўгатэрміновы назіральнік місіі Садружнасці Незалежных Дзяржаў:**

— Працую як назіральнік ужо некалькі тыдняў — з 27 ліпеня. За гэты час наведала некалькі выбарчых акруг Мінска, некаторыя Гомельскай вобласці і ўсе гарадскія ў Гомелі. Азнаёмілася з тым, як працуюць участковыя выбарчыя камісіі: як рыхтуюцца памяшканні, аргтэхніка, месцы для галасавання, дзе будуць стаяць сталы для камісіі, дзе — інфармацыйныя матэрыялы. Усё гэта важна і можа паўплываць на выбарчы працэс.

Але асноўная мая праца заключалася ў тым, каб прысутнічаць на пасяджэнні акруговай камісіі падчас рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. У сувязі з тым, што сёлета актыўна ўдзельнічаюць члены палітычных партый Беларусі, шмат кандыдатаў вылучалася менавіта такім чынам. Але была і вялікая колькасць тых, якія выбіраліся класічным шляхам — зборам подпісаў, вылучэннем ад працоўнага калектыву.

Па кожным кандыдаце было адразу відаць, хто прайшоў працаёмкі шлях, напрыклад праз збор подпісаў. Усё ж такі гэта немалая праца — сабраць больш за тысячу подпісаў ці атрымаць падтрымку працоўных калектываў. Нават тых, у якіх не працуеш. Як прыклад — дырэктар гімназіі, якую падтрымала яе навучальная ўстанова, пасля — найбліжэйшая школа, гарадская паліклініка, а таксама калектыў завода. І ў выніку яна сабрала больш за пяць тысяч подпісаў. Адразу было відаць, што чалавек падышоў да справы грунтоўна.

На жаль, давялося бачыць і такіх кандыдатаў, якія не тое каб фармальна, але безадказна паставіліся да вылучэння. Большасць дапушчаных памылак тычылася недакладнага запаўнення дэкларацыі аб даходах, сабраных подпісаў. Напрыклад, некаторыя «забываліся» на атрыманыя ў гэтым годзе некалькі мільёнаў беларускіх рублёў па дагаворы падраду. Быў у Гомельскай вобласці кандыдат, які не плаціць аліменты на ўтрыманне дачкі і ўвогуле аб'яўлены ў вышук. Наўпрост гэта не ўплывае на рэгістрацыю, але паказвае маральнае аблічча чалавека. Ён таксама не ўказаў у дэкларацыі выйгрыш у казіно. Гэта інфармацыя зачытвалася членам акруговай камісіі і была імі прынята да ведама падчас галасавання.

Увогуле па рэгістрацыі і вылучэнні кандыдатаў, якія вылучаліся ад партый, працоўных калектываў, шляхам збору подпісаў, было відаць, што для ўсіх былі створаны роўныя прававыя ўмовы. Да рэгістрацыі прымяняліся аднолькавыя патрабаванні. Пасяджэнні камісій адбываліся арганізавана і вельмі карэктна ў дачыненні да кандыдатаў. Больш за тое, пасля рэгістрацыі кожнаму кандыдату члены камісіі падрабязна і даступна тлумачылі, якімі могуць быць іх далейшыя крокі. Тым, хто рэгістрацыю прайшоў, казалі, што варта стварацьсвой матэрыяльны фонд, выступаць у прэсе, на тэлебачанні і радыё. Тым, каму было адмоўлена, вельмі карэктна тлумачылася права на абскарджанне рашэння камісіі. Усе пасяджэнні адбываліся ў прысутнасці кандыдатаў, міжнародных назіральнікаў і прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі.

У камісіях працуюць людзі, якія, як правіла, маюць вопыт працы падчас некалькіх мінулых выбарчых кампаній. У іх высокая прававая культура, члены камісій дасканала ведаюць Выбарчы кодэкс. Тым больш што Цэнтральная выбарчая камісія выпусціла друкаваныя дапаможнікі для тэрытарыяльных і акруговых камісій, да якіх можна звярнуцца ў спрэчных момантах.

Зараз жа мы будзем пільна сачыць за тым, як будзе праходзіць перадвыбарная агітацыя, асвятленне выбарчай кампаніі ў СМІ. Штаб місіі назіральнікаў ад СНД ужо сустрэўся з кіраўніцтвам штаба Камуністычнай партыі, РГА «Белая Русь» і ў найбліжэйшы час плануе правесці сустрэчу са штабамі Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці, Ліберальна-дэмакратычнай партыі... Падчас праведзеных ужо сустрэч стала зразумела, што такі дыялог неабходны, бо гэта прамая магчымасць выслухаць заўвагі і прапановы непасрэдных удзельнікаў выбарчага працэсу.

# «ПРЫНЯЛІ ВЕЛЬМІ САРДЭЧНА»

**На пачатку месяца ў нашу краіну прыбыла місія па назіранні за выбарамі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (БДІПЧ АБСЕ). Яе ўзначаліла італьянка — журналіст (цяпер блогер) і палітык Тана дэ Зулуэта, якая ў Беларусі ўпершыню, але за апошнія тыдні ўжо паспела больш даведацца пра наш выбарчы працэс.**

***— Вы не так даўно прыбылі ў Беларусь. Што ўжо паспелі пабачыць і зрабіць?***

— Мы распачалі нашу місію на пачатку жніўня — 2-га чысла, правялі прэс-канферэнцыю. На той момант у нас было 10 экспертаў з 10 краін. Зараз наша каманда папоўнілася яшчэ 38 доўгатэрміновымі назіральнікамі, якія адправіліся для далейшай працы ва ўсе рэгіёны Беларусі. Мы не былі тут, калі адбывалася фарміраванне выбарчых камісій, але паспелі прыехаць, калі пачалася рэгістрацыя кандыдатаў, і таксама цяпер працуем са скаргамі. Нашы доўгатэрміновыя назіральнікі працуюць другі тыдзень, і мы ўжо атрымалі першыя даклады ад іх.

***— Цікава даведацца, якія яны?***

— Даклады паказалі нам, што лічба зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты большая, чым яна была ў 2012 годзе. Дадам, што акрамя гэтага мы сустракаемся з прадстаўнікамі арганізацый і партый. Тое ж самае робяць і доўгатэрміновыя назіральнікі.

***— Падчас сваёй працы на што больш за ўсё звяртаеце ўвагу?***

— Мандат нашай місіі падразумявае тое, што мы ацэньваем усю выбарчую кампанію, не толькі дзень выбараў. І глядзім на яе з двух пунктаў гледжання: ці адпавядае выбарчы працэс нацыянальнаму заканадаўству і міжнародным стандартам. На што паспелі звярнуць увагу? На той факт, што Цэнтральная выбарчая камісія ўвяла ў жыццё некалькі рэзалюцый адпаведна з некаторымі рэкамендацыямі, якія былі дадзены пасля прэзідэнцкіх выбараў у мінулым годзе.

***— Наколькі вам зручна працаваць з уладамі?***

— І выбарчая адміністрацыя, і мясцовыя органы ўлады даступныя да кантакту. Нашы назіральнікі змаглі наведаць некаторыя адкрытыя сустрэчы як выбарчых органаў, так і мясцовых органаў улады. Акрамя таго, мы наведалі пасяджэнне суда, звязанае з выбарчым працэсам. Праўда, пакуль не ўся інфармацыя, датычная скаргаў, размешчана на сайце ЦВК.

***— Ці давялося вам ужо сустракацца са штабамі іншых міжнародных назіральнікаў?***

— Такія сустрэчы ўжо адбываліся. Напрыклад, з дэлегацыяй па назіранні за выбарамі місіі ад СНД. Мы сустрэліся ў нашым офісе з намеснікам яе кіраўніка. Абмяняліся інфармацыяй, што мы робім і што яны. Плануем сустрэчу з імі ў дзень выбараў у другой палове дня. Мы таксама сустрэліся з місіяй, якую накіравала Парламенцкая асамблея Савета Еўропы. Для іх быў арганізаваны брыфінг, дзе мы расказалі, якім чынам працуем, і далі максімальна падрабязную інфармацыю аб выбарах у Беларусі. Гэта ўжо 9-ты раз, калі місія БДІПЧ АБСЕ назірае за выбарамі ў краіне, і, безумоўна, нам ёсць пра што расказаць. Мы сустракаліся і з дэлегацыяй Парламенцкай асамблеі АБСЕ і яе спецыяльным каардынатарам Кентам Харстрэдам. У дзень выбараў мы будзем разам назіраць за выбарамі, і наш канчатковы даклад будзе распрацаваны разам з дэлегацыямі Парламенцкіх асамблей Савета Еўропы і АБСЕ.

***— Вам за апошнія гады давялося назіраць за выбарамі ў розных краінах. Чым адметны выбарчы працэс у Беларусі?***

— Такое параўнанне не ўваходзіць у нашу метадалогію. Кожныя выбары для нас — гэта свежая, новая справа, якая ацэньваецца ў адпаведнасці з нормамі, пра якія ўжо казалася. Трэба падкрэсліць, што для ўсіх краін выкарыстоўваецца адна і тая ж метадалогія. Вельмі хутка мы распачынаем місію і ў Злучаных Штатах Амерыкі, і ў Расіі. І там, і там метадалогія будзе аднолькавая, і гэта самае важнае ў нашай працы — агульныя стандарты для ўсіх краін.

Заўсёды вельмі карысна ўзбагаціць свой досвед назірання за выбарамі. Мне давялося быць назіральнікам у Францыі і Чэхіі, таксама ў Турцыі, Азербайджане, Украіне, нават у краінах Афрыкі і Азіі. Адзіны кантынент, дзе яшчэ не паспела папрацаваць, — гэта Амерыка. Але не: я была кароткатэрміновым назіральнікам у Гватэмале. Таму і гэты кантынент залічым *(смяецца)*.

***— Напрыканцы, калі ласка, падзяліцеся, як вам Беларусь?***

— Знаходзімся мы тут досыць нядаўна, але можна сказаць, што я была прынята вельмі сардэчна. І ў такім рэчышчы праходзяць усе мае дні. Зразумела, што я вельмі чакаю магчымасці падарожнічаць і пабачыць іншыя рэгіёны, каб больш даведацца пра вашу краіну.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■

# Прыемныя клопаты


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
Работа кіпіць на ўсіх вуліцах горада.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Начальнік аддзела архітэктуры і будаўніцтва Рагачоўскага райвыканкама Вольга ДАРАШЭНКА** гаворыць, што асноўныя работы пачаліся каля паўгода таму, але падрыхтоўчыя — з канца мінулага года:

— Ужо зроблена набярэжная з выхадам на раку Днепр. Ідуць актыўныя работы па рэканструкцыі асноўных транспартных артэрый, па добраўпарадкаванні парку, заканчваецца рэканструкцыя цэнтральнага стадыёна і вядзецца добраўпарадкаванне цэнтральных вуліц нашага горада. Абнаўляюцца фасады будынкаў і дваровыя тэрыторыі. Паркавая зона стане месцам сустрэчы гасцей на Дні беларускага пісьменства.

Камунальнікі таксама актыўна ўключаны ў працэс пераўтварэння горада. **Дырэктар мясцовай камунальнай гаспадаркі Яўген САВЕЛЬЕЎ** адзначае, што да 3-4 верасня горад будзе добраўпарадкаваны капітальна:

— Нам выдзелена каля 40 млрд рублёў на правядзенне работ. Мы спадзяёмся, што госці прыемна здзівяцца і парадуюцца за нас і разам з намі. Мы выканалі работы па бягучым рамонце жыллёвага фонду. Па ўязных дарогах адбываецца замена агароджаў — ставіцца сучасны металапрофіль. Фарбуюцца фасады будынкаў, аднаўляюцца ці фарбуюцца дахі, вядзецца добраўпарадкаванне горада: азеляненне, пасадка дрэў... Жыхары Рагачова адчуюць паляпшэнне якасці вады — будзе пушчаны другі комплекс станцыі абезжалезвання. Практычна ва ўсім горадзе адноўлены водаправод: заменена 12 км водаправодных сетак.

На гэтым гадзінніку пакуль няма стрэлак. Але якія лічбы!

У тэставым рэжыме ў Рагачове пачаў работу Дом кнігі. Яго ўрачыстае адкрыццё запланавана на Дзень беларускага пісьменства, але ж жыхары горада ўжо ведаюць пра падарунак, які быў ініцыяваны Міністэрствам інфармацыі. Гісторыя будынка, у якім цяпер знаходзіцца новая ўстанова, пачынаецца з 1909 года. Спачатку яго пабудавалі для земскай управы, якая існавала да 1924 года. Потым тут быў палац Працы. Пасля — кінатэатр, райвыканкам, гарвыканкам і нават аддзел ЗАГС. З 1980 года ў будынку размяшчалася на першым паверсе бібліятэка для дарослых, а на другім — Дом піянераў. І вось цяпер, пасля капітальнага рамонту, абодва паверхі аддадзены кнізе. У адным месцы нарэшце аб'ядналіся бібліятэкі дарослая і дзіцячая, а частку памяшканняў на першым паверсе заняла прыгожая прасторная кнігарня. Да гэтага кнігі рагачоўцы або заказвалі прыватнікам, або прывозілі з іншых гарадоў. **Загадчык крамы Вольга СУРНАЧОВА** гаворыць, што людзі ўжо ацанілі наяўнасць новай установы:

— Людзі прыходзяць і кажуць: «Ну, нарэшце». А настаўнікі горада і раёна проста шчаслівыя — у адным месцы можна набыць усе дапаможныя матэрыялы. Тут ёсць усё тое, па што яны раней ездзілі ў Жлобін, Гомель або Мінск.

Дзверы ў дзверы з крамай — чытальная зала бібліятэкі, якая носіць імя Уладзіміра Караткевіча. Яе фонд складае 96 тысяч экзэмпляраў, але ж тут спадзяюцца, што падчас свята фонд значна папоўніцца. Бо гасцям, якія з'едуцца на ўрачыстую цырымонію адкрыцця з усёй Беларусі, краін блізкага і далёкага замежжа, прапанавалі прывезці з сабой і падарыць любімую кнігу. **Дырэктар Рагачоўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Таццяна ГОЛУБЕВА** заўважае, што апошнім часам вяртаецца цікавасць да друкаванай кнігі.

— Да нас прыязджаюць многія пісьменнікі. Тут у адным месцы ўсё разам — аддзел абслугоўвання і інфармацыі — для дарослых чытачоў і дзіцячы аддзел.

Цікавая прыдумка, увасобленая ў чытальнай зале — велізарны насценны гадзіннік. Механізма пакуль няма, але яго хутка прывязуць і ўсталююць. А вось лічбы на цыферблаце — вокладкі кніг з назвамі-лічэбнікамі: «Адзін дзень Івана Дзянісавіча», «Два капітаны», «Тры таварышы», «Чацвёртая вышыня», «Пяць тыдняў на паветраным шары», «Шэсць апавяданняў, напісаных ад першай асобы», «Сем дзён тварэння», «Васьмёрка», «Дзевяць прынцаў Амбера», «Дзесяць негрыцянят», «Адзінаццаць хвілін» і «Дванаццаць крэслаў».

Дзень беларускага пісьменства пройдзе ў Рагачове 4 верасня, аднак інтэрактыўныя пляцоўкі пачнуць працаваць ужо трэцяга, нагадвае шырокую праграму мерапрыемстваў **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Міхаіл ЗАЙЦАЎ:**

— У райцэнтры будзе працаваць 16 сцэнічных пляцовак, галоўная з якіх змесціцца на цэнтральнай плошчы. Сярод найбольш яркіх момантаў свята — адкрыццё выставы «Па-сучаснаму народны», прысвечанай жыццю і творчасці Андрэя Макаёнка, «Славянскія літаратурныя Дажынкі-2016», тэлемост з пабрацімамі Рагачова — Кацельнікамі (Расія) і Навагрудам-Валынскім (Украіна), спектакль «Пясняр» Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага. Усяго запланавана больш за 70 мерапрыемстваў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

# Зямлю не падманеш

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Што тычыцца клімату, то ўся восень летась была вельмі засушлівай. Гэта прывяло да таго, што сеялі літаральна ў пясок і насенне апынулася на вялікай глыбіні (да 10 см). Пакуль расліна выбіралася наверх, яна слабела. У такіх умовах было неабходна больш падкормкі, якую выкарыстоўвалі не ўсе гаспадаркі. Менавіта гэта дрэнна адбілася на азімых. Не вельмі добра надвор'е паўплывала і на яравыя. Думаю, многія адчулі на сабе, наколькі быў гарачым ліпень. А менавіта ў гэты час ячмень, авёс, яравая пшаніца фарміруюць свой наліў, і ліпень практычна «падпаліў» іх. Акрамя таго, у некаторых гаспадарках краіны да гэтага часу існуе меркаванне, што ў дачыненні да збожжавых культур заўсёды дзейнічае формула «больш пасеем — больш пажнём». Пры гэтым аграрыі парушаюць структуру пасеваў, што прыводзіць да адмоўнага выніку, бо зямлю падмануць немагчыма. А калі б структура пасеву выконвалася лепш, то менш прыходзілася б марнаваць дзяржаўныя грошы на сродкі аховы і ўгнаенні, што сёння крытычна важна. Істотна ўзрасла б і ўраджайнасць, нават нягледзячы на зменлівасць надвор'я.

***— Кажучы аб клімаце, наколькі ён стаў менш спрыяльным для збожжавых?***

— Змена клімату за 20 гадоў адбылася досыць значная — пацяплела на 1 градус. Пры гэтым перапады тэмператур паміж днём і ноччу сталі больш рэзкімі. Менавіта гэта найбольш негатыўна ўплывае на ўраджай. Напрыклад, нізкая начная тэмпература дрэнна ўплывае на кукурузу, якая больш актыўна

Фота БЕЛТА.

расце менавіта ў гэты час, калі цёпла. Таксама павялічылася і колькасць пылавых бур. Гадоў 10 таму іх лік вар'іраваўся ў межах 80 на год, а сёння дасягае 360. Змянілася і частата выпадзення ападкаў. Яшчэ некалькі гадоў таму яны выпадалі больш раўнамерна і навукоўцы ведалі нормы іх выпадзення. Сёлета ў пачатку жніўня колькасць ападкаў за два дні перавысіла месячную норму. Перад навукоўцамі стаіць важная задача — адаптаваць расліны да кліматычных змен. Тыя традыцыйныя культуры, якія сёння вырошчваюцца, робяцца намі больш устойлівымі да засухі. Таксама асаблівую ўвагу надаём і менш звыклым для нашых шырот раслінам, напрыклад, кукурузе, соі, сланечніку. Некаторае пераасэнсаванне падбору сартоў сёння неабходна для кожнага рэгіёна з улікам асаблівасцяў глебы. Задача перад селекцыянерамі ставіцца непасрэдна прыродай. Хачу адзначыць, што менавіта нашы беларускія сарты і гібрыды больш адаптаваныя сёння да нашага клімату. Ніякія іншыя замежныя сарты няздольныя даць больш высокую ўраджайнасць у такіх напружаных умовах, якія сёння мы можам назіраць на палях.

***— Ці спрабавалі навукоўцы стварыць «універсальны сорт» збожжавых, які меў бы высокую ўраджайнасць пры любым клімаце?***

— Такія сарты ўжо ствараліся. Аднак любы ўніверсальны сорт будзе ў чымсьці адставаць ад таго, які створаны спецыяльна для пэўных умоў надвор'я і асабліваснуў уборачнай тэхнікі. Акрамя таго, нельга стварыць ідэальнага «ўніверсала», які б ідэальна спраўляўся і са спёкай, і з холадам. Ген, які адказвае за супраціўляльнасць замаразкам, будзе нейтралізоўваць ген, які спрыяе прыстасаванню да павышанай тэмпературы. Як правіла, калі селекцыянер хоча дасягнуць добрага эфекту ад сорту, ён стварае яго пад пэўныя ўмовы.

***— На ваш погляд, чаму Віцебская вобласць да гэтага часу застаецца праблемнай па ўраджайнасці збожжавых і зернебабовых?***

— Некалькі гадоў таму, калі прэм'ер-міністрам быў Міхаіл Мясніковіч, ён у Смалявічах праводзіў сход, падчас якога прадстаўнікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, аблвыканкамаў і навукоўцы абмяркоўвалі структуру пасяўных плошчаў кожнай вобласці краіны. Тады я выступіў з дакладам, у якім прагучала неабходная з пункту гледжання навукі структура пасеву. Яна б дазваляла атрымліваць максімальную аддачу падчас уборкі ўраджаю. І яе прынялі. Аднак да гэтага часу яна не выконваецца многімі гаспадаркамі, у тым ліку і ў Віцебскай вобласці. На месцах прыходзяць новыя кіраўнікі, якія адказваюць за пасяўную і ўборачную кампаніі і пачынаюць свае «эксперыменты» за кошт дзяржавы, не звяртаючы ўвагі на даныя навукі. Такія дзеянні прыводзяць да дрэнных вынікаў. У такой «пагоні за ўраджаямі» структура пасеву парушаецца на карысць тых культур, якія даюць вялікую аддачу, але ў якіх пры гэтым няма патрэбы. Так, напрыклад, адбываецца з пасевамі трыцікале. У гэтай культуры спраўды высокая ўраджайнасць, але яна не патрэбна ў такім аб'ёме. Збожжа для харчовых мэтаў беларусам трэба крыху больш за 1 млн тон. Астатняе неабходна для жывёлагадоўлі, дзе больш запатрабаваныя высокабялковыя збалансаваныя культуры. Пагоня за «прывідным ураджаем» у канчатковым выніку шкодзіць усім. Сёння тыя гаспадаркі, якія выконваюць рэкамендацыі нашага Навукова-практычнага цэнтра па земляробстве, маюць высокую ўраджайнасць і валавы збор збожжа.

***— Ці былі звароты ў Навукова-практычны цэнтр па земляробстве з боку кіраўнікоў раёнаў або гаспадарак Віцебшчыны пасля рабочай паездкі туды Прэзідэнта, падчас якой кіраўнік краіны паставіў дакладную задачу: вызначыцца са спецыялізацыяй выпуску сельгаспрадукцыі ў кожным раёне?***

— Не, такіх зваротаў да нас пакуль не было... Дарэчы, наш Навукова-практычны цэнтр праводзіць так званыя дні поля, на якіх мы прадстаўляем свае распрацоўкі і праводзім кансультацыі для ўсіх ахвотных. Варта адзначыць, што беларускія гаспадаркі цікавяцца гэтымі мерапрыемствамі значна менш, чым замежныя прадстаўнікі. Да нас прыязджаюць і дэлегацыі з Германіі, Літвы, Венгрыі, Сербіі, Польшчы, Расіі, Украіны, Казахстана.

***— Над якімі новымі праектамі сёння працуюць беларускія селекцыянеры?***

— Я думаю, многія ведаюць, што створаны сарты пшаніцы спецыяльна для хлебапячэння і асобна для жывёлагадоўлі. Але часта яны загружаюцца без разбору ў адно і тое ж месца для транспарціроўкі і ў канчатковым выніку выкарыстоўваюцца не па прамым прызначэнні. У сувязі з гэтым мы паставілі сабе задачу атрымліваць сарты пшаніцы з абалонкай зерня пэўнага колеру. Напрыклад, абалонка пшаніцы для пякарні будзе жоўтага колеру, а для кармоў зялёнага. Сёння мы ўжо атрымалі вопытныя прыклады кармавой пшаніцы з чырвонай абалонкай. Пры гэтым акрамя колеру абалонкі астатнія якасці такіх сартоў застаюцца нязменнымі. Гэта зменіць падыход гаспадарак пры транспарціроўцы сартоў пшаніцы і павысіць якасць прадукцыі ў кожнай з галін, для якіх яна вырошчваецца.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

■ Бяспека

# «ПАЛАНЭЗ» НА ВАРЦЕ АЙЧЫНЫ

Комплекс рэактыўнай сістэмы залпавага агню (РСЗА) «Паланэз» паступіў на ўзбраенне 336-й рэактыўнай брыгады Узброеных Сіл РБ. У брыгадзе прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы, на якіх прысутнічалі Міністр абароны, прадстаўнікі Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта.

«Многія тэхнічныя рашэнні, рэалізаваныя ў рэактыўнай сістэме залпавага агню беларускімі распрацоўшчыкамі, не маюць аналагаў у свеце. Прыняцце новых узораў узбраення з'яўляецца адным з элементаў стратэгічнага стрымлівання. Рэактыўныя сістэмы залпавага агню з'яўляюцца найбольш магутным сродкам агнявой падтрымкі наземных груповак войскаў. РСЗА дазволіць значна павысіць баявую магчымасць ракетных войскаў і артылерыі і абарончыя магчымасці дзяржавы ў цэлым», — адзначыў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ.**

Вайскоўцы 336-й рэактыўнай брыгады з тэхнікай ужо добра знаёмыя. Максім Яцко старшы лейтэнант, камандзір разліку, які здзейсніў першы пуск, сказаў: «Калі рабілі першы пуск, усе былі ўпэўненыя, што ракета трапіць сапраўды ў цэль. Так і атрымалася. Тэхніка з кожным годам становіцца ўсё больш мадэрнізаванай і аўтаматызаванай, салдаты хутка яе асвойваюць».

Галоўныя тактыка-тэхнічныя характарыстыкі РСЗА «Паланэз» адпавядаюць найлепшым узорам замежнай артылерыі. Усяго адна баявая машына здольная адначасова нанесці ўдар па 8 цэлях на адлегласці ад 50 да 200 кіламетраў. Ракета мае малую адлюстравальную паверхню, высокую хуткасць і нават здольная ажыццяўляць у паветры супрацьракетны манеўр — прадухіліць яе пападанне амаль што немагчыма.

**Сяргей НІКАНОВІЧ.**
**Фота аўтара**

■ Навіны раённага рынку

# Пачым, бабуля, агурочкі?

**«Вы паглядзіце, якія яны смачныя, салодкія!» Усе гэтыя пахвалы адносяцца да памідораў у вядзерцы. Жанчына за дашчатым прылаўкам прапаноўвае кілаграм смакаты за паўтара рубля. На глыбоцкім рынку, асабліва ў нядзелю, тут такая цётачка не адна — з васьмі раніцы стаіць даўжэзны рад прадаўцоў, якія гандлююць усім, чым толькі ўрадзіла зямля.**

У каго не хапіла сыравіны для нарыхтовак на агародзе, той выпраўляецца на рынак. Самай запатрабаванай агароднінай сталі агуркі і памідоры. «Разбіраюць усё за раніцу», — кажа гандлярка з напаўпустой скрыняй агуркоў. Іх кошт на рынку ад 66 капеек да 1 рубля. Таматы даражэйшыя, 1-1,5 рубля. Купляюць як кілаграмамі — на стол, так і вёдрамі — для хатніх кансерваў.

Гандаль ягадамі і грыбамі не такі маштабны. Літровы слоік ажын з уласнага саду каштуе 2 рублі. Прадавец вырошчвае ягады для сябе, а што застаецца пасля нарыхтоўкі, адносіць на рынак. Тавару няшмат, ды і купляюць яго пераважна паласавацца дзецям. За шклянку несезонных ужо суніц бабуля папросіць 3,5 рубля, тры буйныя галоўкі часнаку абыдуцца ў тры рублі, кілаграм дамашняга сыру з каровінага малака каштуе 5 рублёў. Гандляр «салодзенькім» прапануе мёд з уласнага пчальніка па 5 рублёў за 250 грамаў. На рынак мужчына завітвае пад настрой, кажа, што купляюць мёд хіба на лекі, а каму трэба, дамаўляецца загадзя і сам забірае слоік.

Самая гнуткая цана аказалася ў бульбы. Калі пахадзіць па рынку, можна пабачыць цэннікі ад 1 рубля 70 капеек да 20 капеек за кілаграм. Звычайна прадаецца сумесь сартоў, хоць можна знайсці «ласунак» па 40 ці «скарб» па 60 капеек.

Наогул, на мясцовым рынку свае асаблівыя адносіны, бо ці не кожны сустрэчны — знаёмы або аднавясковец. Тут пакупнік дае парады прадаўцу. Апошні абмяркоўвае тавар з суседам. Старыя знаёмыя дамаўляюцца на абмен. Вядуцца спрэчкі пра якасці сартоў, абмяркоўваюцца спосабы, як прышчапіць ажыны, як даглядаць парэчкі, чым ратаваць памідоры ад хвароб. Тут можна пабачыць «народную дэгустацыю», калі парэзаны на кавалачкі яблык каштуюць адразу чатыры чалавекі,

намагаючыся вызначыць сорт. Адначасова чуеш гісторыю не толькі загадкавага яблыка, але і гісторыі пра ўсе салодкія яблыкі наогул.

**На мясцовым рынку свае асаблівыя адносіны, бо ці не кожны сустрэчны — знаёмы або аднавясковец.**

Трапляюцца тут і дзівосы. На газеце перад прадаўшчыцай ляжаць кучкі круглых грыбкоў белага колеру памерам з кулачок дзіцяці. Я, чалавек у народнай медыцыне не дасведчаны, напачатку падумала, што жанчына гандлюе шампіньёнамі.

— Гэта вясёлка, лекавыя грыбы, — тлумачыць тая. — Іх можна сырымі выкарыстоўваць, а можна настой рабіць. Трыццаць тысяч за пяць штук.

— І ад чаго дапамагае? — асцярожна разглядваю тавар я.

— Ад усяго! — агаломшвае цётка. І тут жа расказвае, як цудадзейная вясёлка дапамагла ацаліцца знаёмым. У адной жанчыны настой вылечыў гуз над вокам, у другой суняў боль у жываце...

Верыць у народную медыцыну ці не — залежыць ад перакананняў пакупніка. А вось грыбы на суседнім прылаўку не выклікаюць сумненняў. Кучка прыгажуноў падасінавікаў каштуе 2 рублі, 10-літровае вядро дробных лісічак — 5, лісічкі буйныя прадавец прапануе за 3 рублі. Сам сябе мужчына называе чалавекам ад прыроды. Любіць паблукаць па лесе, пасядзець з вудаю на возеры. Продаж ляснога ўраджаю становіцца дадатковым заробкам.

— Здаваць грыбы нарыхтоўшчыкам спрабавалі?

— Неяк вырашыў дапамагчы нявестцы. Ад прадпрыемства кожны год патрабуецца здаць пэўны план лесанарыхтовак: ягад, грыбоў. Вырашыў прынесці чатыры кілаграмы лісічак. А прыёмшчык пачаў прыдзірацца, маўляў, шляпкі павінны быць тры сантыметры, без надломаў. Расчараваўся. На рынку прасцей: калі пакупніку не падабаецца, ён проста не купіць.

На глыбоцкім рынку сустракаюцца прадпрымальнікі з іншых рэгіёнаў Беларусі. Прыязджаюць гандляры з Віцебска, Брэста, Пінска. Поўдзень Беларусі больш цёплы, там гародніна не так адчувае пахаладанні. У паўночных раёнах фермер павінен хаваць пасадкі ад выпадковых замаразкаў пад плёнкай або праводзіць ацяпленне. Як вынік, пінчане едуць сюды ад канкурэнцыі падалей.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ**

Вечар у Радашковічах. Бліжэе восень

Яўгена ПЯСЕЦКАГА

## фота слова

*Там, дзе знічак рой начны*
*Падае у росы,*
*Жнівень пасвіць туманы*
*На старых пакосах.*

*Шмат прайшоў я па жыцці,*
*Але, з Божай ласкі,*
*Сёння мне чарга ісці*
*Жніўню у падпаскі.*

*Пойдзем поруч я ды ён,*
*Песні заспяваем.*
*На зыходзе летніх дзён*
*Верасень спаткаем.*

*Ад Гарыні да Дзвіны*
*Ў восеньскім спакоі*
*Будзем пасвіць туманы*
*Спеўнай талакою.*

# ПОШУК СТАБІЛЬНАГА «КВАДРАТА»

**Сярэдні цэннік ліквідных двухпакаёвых кватэр, якія карыстаюцца стабільным попытам у кліентаў, складае цяпер ад 220 да 250 долараў.**

## ПОПЫТ ДАГНАЎ ПРАПАНОВУ

Яшчэ ўвесну было цяжка менавіта гаспадарам пустога жылля, бо прапанова ўдвая перавышала попыт. Цяпер спакойная сітуацыя для патэнцыйных кватарантаў крыху змянілася, бо на арэндны рынак пачалі звяртаць увагу маладыя сем'і і спецыялісты, якія вырашылі «зачапіцца» ў сталіцы, а прыкладна з трэцяй дэкады ліпеня на рынку назіраецца яшчэ і невялікая хваля студэнцкай актыўнасці. Не, паводле слоў нашага эксперта, ніякага ажыятажу не існуе, але ад кліентаў штодзень агенцтва атрымлівае каля 70 заявак на арэнднае жыллё. Пры гэтым лічба прыкладна адпавядае і колькасці ўзнікнення на рынку новых аб'ектаў ці крыху перавышае яе.

## АДШУКАЮЦЬ АДНАПАКАЁЎКУ І ЗА 150 ДОЛАРАЎ

Існуюць сёння на рынку часам і ўвогуле бюджэтныя варыянты маленькіх кватэр, якія выстаўлены па 150-160 долараў. Гэта так званыя слабенькія кватэры з мэбляй савецкіх часоў, са старой бытавой тэхнікай або абстаўленыя толькі часткова. Звычайна жыллё такога цэнавога ўзроўню сустракаецца ў Чыжоўцы, мікрараёнах Сухарава і Шабаны. Падобных варыянтаў сёння няшмат, але яны ёсць. Нягледзячы на таннасць гэтых аб'ектаў, попыт на іх невялікі, бо сучасны кліент часцей гатовы дабавіць яшчэ 20-30 долараў, але дакладна жыць у камфортным і больш якасным жыллі.

**Гаспадары зусім не супраць свойскіх жывёл, але пры наяўнасці ў кватэры дарагіх шпалер яны могуць патрабаваць у кватарантаў пакінуць пэўную суму задатку на выпадак псавання маёмасці.**

Сучасны мінскі кватарант з большай цікавасцю разглядае варыянты цалкам укамплектаваных нестарой мэбляй кватэр, дзе сярод бытавых прыбораў абавязкова прысутнічае пральная машына. Сярэдні цэннік арэнды падобных апартаментаў у галоўным мегаполісе краіны складае 180-200 долараў. Сярод амаль аднолькавых па якасці і кошце кватэр прыярытэт аддаецца жыллю ў новабудоўлях з развітай інфраструктурай. А вось стандартныя кватэры за 250 долараў, нават з дарагім рамонтам, могуць «вісець» у каталогах агенцтваў нерухомасці па месяцы і нават больш.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ПЛЮС 5-9%

Яшчэ сёння на рынку прыватнай арэнды магчыма знайсці бюджэтныя варыянты двухпакаёвых кватэр, мінімальны цэннік на якія пачынаецца з 180 долараў. Зразумела, што добрай мэблі і якаснага рамонту за такія грошы ў падобных кватэрах не будзе. Сярэдні цэннік ліквідных двухпакаёвых кватэр, якія карыстаюцца стабільным попытам у кліентаў, складае цяпер ад 220 да 250 долараў. Існуюць у наяўнасці і нядрэнныя двухпакаёўкі ў новабудоўлях. Падобныя варыянты жылля ўвогуле без мэблі цяпер прапануюцца за 200-220 долараў.

Мінімальная цана арэнды трохпакаёвых кватэр (без мэблі ці часткова з ёй) вагаецца ў межах ад 230 да 250 долараў. Галоўным чынам такое жыллё прапануецца за 250-300 долараў. Варыянтаў шматпакаёвак на рынку нямнога, але і попыт на іх невялікі.

Наш эксперт адзначыла, што цана арэнды на сталічным рынку да сярэдзіны ліпеня была крыху ніжэйшай. А вось потым актыўнасць студэнтаў паралельна з памяншэннем прапановы крыху падкарэктавалі цэнавы трэнд на рынку. Толькі за апошні месяц цэны на здымнае стандартнае жыллё ў прыватным сектары павялічыліся на 5-9%.

## СТУДЭНЦКІ БУМ — ДА СЯРЭДЗІНЫ ВЕРАСНЯ

Цяпер у буйнейшым сталічным агенцтве нерухомасці колькасць заказаў ад патэнцыйных кватарантаў практычна адпавядае новым паступленням свабодных кватэр. Актыўная дзейнасць рынку, звязаная з жыллёвымі праблемамі студэнтаў, працягнецца максімум да 15-20 верасня, лічыць спадарыня Пачыцкая.

Цікава, а якое жыллё сёння заказвае ў агенцтва яго масавы кліент? Галоўным чынам ім неабходна аднапакаёвая кватэра з мэбляй і бытавой тэхнікай у добрым стане за стаўку арэнды да 200 долараў у месяц. Па двухпакаёвай кватэры цэннік арэнды павінен быць да 250 долараў.

Сярод новых павеваў у сферы арэнды сталі патрабаванні кватарантаў, каб у іх здымнай кватэры быў абавязкова нехта прапісаны (зарэгістраваны), а таксама, каб з уласнікам кватэры быў заключаны афіцыйны дагавор у ЖЭСе. Гэтыя патрабаванні цалкам зразумелыя, бо ў кватэры, дзе ніхто не зарэгістраваны, «жыроўка» за ацяпленне зімой можа павялічыцца да шалёных лічбаў. Заключэнне дагавора (дзе агучаны памер аплаты) у час амаль мінімальных цэнніка ў на арэнду дадае кватаранту ўпэўненасці, што ўжо заўтра тарыф арэнды гаспадаром кватэры істотна не павялічыцца.

## ЗГАДАЖАЮЦЦА НА МАЛЕНЬКІХ ДЗЕТАК І НАВАТ СВОЙСКІХ ЖЫВЁЛ

За апошні час істотна змянілася і само стаўленне ўласнікаў жылля да сваіх патэнцыйных кватарантаў. Калі раней гаспадары свабоднага жылля даволі скрупулёзна выбіралі сабе пастаяльцаў, то цяпер іх палітыка на гэты конт стала больш гнуткай.

Цяпер адсутнічае катэгарычнае табу на сем'і з малымі дзецьмі, кампанію з двух-трох студэнтаў, а таксама на амаатараў цягаць з сабою па здымных кватэрах кошак і сабак. Аднак стаўленне да апошніх з разраду катэгарычна адмоўнага трапіла ў ранг выключна дзелавых адносін. Гаспадары зусім не супраць свойскіх жывёл, але пры наяўнасці ў кватэры дарагіх шпалер яны могуць патрабаваць у кватарантаў, пакінуць пэўную суму задатку на выпадак псавання маёмасці. Звычайна памер такога задатку складае цану месячнай арэнды жылля або палову ад такой стаўкі. У гэтым выпадку спецыялісты рынку арэнды раяць патэнцыйным кватарантам загадзя агаварваць падобныя нюансы з уласнікамі жылля і, пажадана, фіксаваць такія дэталі ў дагаворы.

Маргарыта Пачыцкая адзначыла, што сёлета ў жніўні самым масавым іх кліентам былі студэнты апошніх курсаў, маладыя сем'і і адзінокія жанчыны і мужчыны. Дарэчы, колькасць адзінокіх кватарантаў у апошні час пачала павялічвацца. Па ўзроставым паказчыку такія асобы маюць за плячыма 30 плюс-мінус 5 гадоў. Гэта тыя людзі, якія не маюць вялікіх матэрыяльных праблем, таму вырашылі пажыць асобна ад бацькоў. А вось маладых спецыялістаў на рынку прыватнай арэнды пакуль не шмат. Магчыма, што гэта катэгорыя патэнцыяльных кліентаў агенцтваў нерухомасці пачне больш актыўна «варушыцца» наконт жылля менавіта ў верасні.

## ДАЛЕЙШАГА ПАДАРАЖАННЯ НЕ ПЛАНУЕЦЦА

Спецыялісты рынку прыватнай арэнды Мінска адзначаюць, што тэндэнцыя па актыўнай здачы жылля ў наём працягнецца прыкладна да сярэдзіны верасня. Потым студэнцкі бум скончыцца і цэнавы ўзровень арэнды зафіксуецца на сённяшнім базавым узроўні. Ніякага істотнага павелічэння арэндных ставак ці іх памяншэння ў найбліжэйшыя месяцы не прадбачыцца. Гэта пры ўмове, што сярэдняя працоўная катэгорыя жыхароў Мінска будзе і надалей атрымліваць стабільныя сённяшнія заробкі ў пераліку на доларавы эквівалент. Між іншым, пры рэзкім змяненні курсу замежнай валюты эксперты рынку не выключаюць і памяншэнне ставак прыватнай арэнды ў доларавым эквіваленце.

## РЫЗЫКА САМАСТОЙНАГА ПОШУКУ

Вядома, што арганізаваны падбор здымных кватэр праз агенцтвы каштуе кліенту пэўных грошай. Таму часам кватаранты спрабуюць шукаць такое жыллё самастойна і ў электронным фармаце праз інтэрнэт. У сацыяльных сетках узнікаюць цэлыя спецыялізаваныя групы, дзе прысутнічае шмат аб'яў аб здачы жылля.

Так, варыянтаў там бывае сапраўды шмат, але на самой справе адказнасць за сапраўднасць падобнай інфармацыі ніхто не нясе. Больш за тое, у некантраляванай структуры прадпрымальніцкай дзейнасці (а падобныя сайты і выконваюць такую функцыю) трапіць у нейкую махлярскую пастку з арэндай непадрыхтаванаму кватаранту значна прасцей.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Разумныя грошы

# З «ЗАЛАТЫМ ПЛАСТЫКАМ» І Ў БАРБАДАСЕ ЯК ДОМА

**Аналітыкамі банкаўскай сферы было выяўлена, што заможныя беларусы для падарожжаў найчасцей выбіраюць Вялікабрытанію, ЗША і Люксембург**

**Спецыялісты падлічылі, што летась нашы суайчыннікі з грашыма пабывалі ў 115 краінах свету. Сярод самых папулярных — Расія і Вялікабрытанія, але сустракаюцца і экзатычныя напрамкі, накшталт Каба-Вердэ, Сінгапура і Макаа. Пра гэта нам паведамілі ў адным з беларускіх банкаў, дзе спасылаюцца на маркетынгавае даследаванне замежных транзакцый з выкарыстаннем прэміум-картак (Gold, Platinum, Infinite).**

Увогуле, нашы людзі ў апошнія гады сталі значна часцей плаціць банкаўскімі карткамі як унутры краіны, так і за мяжой. Уладальнікі прэміяльных картак трапілі ў лік самых актыўных прыхільнікаў безнаяўных плацяжоў. Напрыклад, эксперты аднаго з банкаў сабралі інфармацыю пра тое, у якіх краінах за мінулы год ажыццяўляліся транзакцыі з дапамогай прэміум-картак.

## АД РАСІІ ДА ЛАТВІІ

Самай папулярнай краінай для мясцовых багацеяў прадказальна апынулася Расія — на яе прыходзіцца пятая частка ўсіх транзакцый уладальнікаў «голдавых» картак. Другое месца займае Вялікабрытанія, у якой праходзіць 15% замежных аперацый з удзелам беларускіх прэміум-картак. На трэцім месцы — Польшча з 10% замежных транзакцый.

У топ-5 самых-самых краін таксама ўвайшлі Літва і ЗША. Акрамя таго, забяспечаныя беларусы часта карыстаюцца прэміум-карткамі ў Люксембургу. Папулярнымі напрамкамі для падарожжаў з'яўляюцца таксама Італія і Іспанія. За імі ідзе Украіна, а апошняе месца ў першай дзесятцы заняла Латвія.

## КІТАЙ, БРАЗІЛІЯ І БАРБАДАС

І хоць часцей за ўсё беларусы расплачваюцца прэміум-карткамі ў Еўропе, наведваюць яны і азіяцкія краіны, у тым ліку ААЭ, Казахстан, Кітай і Індыю. Значна радзей нашы заможныя землякі падарожнічаюць па Афрыцы (Егіпет не ўвайшоў нават у 30-ку), нячаста іх сустрэнеш і ў краінах Паўднёвай Амерыкі, дзе нашым людзям больш за ўсё імпануе Бразілія. Сярод экзатычных краін спецыялісты адзначаюць Каба-Вердэ, Макаа, Сінгапур, Кубу і Ямайку. Беларусаў з дастаткам таксама прыцягваюць карлікавыя дзяржавы, у тым ліку Ватыкан, Манака, Андора, Ліхтэнштэйн, Маўрыкій і Барбадас.

## БЕЗ НАЯЎНЫХ, УВОГУЛЕ

«Геаграфія падарожжаў уладальнікаў «залатых» картак вельмі шырокая — ад Бразіліі да Нарвегіі. Паказальна, што ў спісе самых папулярных краін апынуліся няблізкія нам па адлегласці Вялікабрытанія, ЗША і Люксембург, — адзначае куратар партнёрскай праграмы Golden Alfa Анастасія Пятровіч. — Пры гэтым колькасць замежных транзакцый пастаянна расце, бо людзі аддаюць перавагу браць у паездку картку і не рызыкаваць вялікай сумай папяровых грошай. Акрамя

таго, трымальнік прэміяльнай карткі мае шэраг пераваг. Прыярытэтны доступ у VIP-залы аэрапортаў, асабісты кансьерж-сэрвіс, медыцынская і юрыдычная падтрымка дазваляюць адчуваць сябе больш упэўнена нават у самым экзатычным падарожжы».

Таксама банкаўскія аналітыкі паведамляюць пра тое, з якімі запытамі часцей за ўсё звяртаюцца ў кансьерж-службу. Высветлілася, што часта ўладальнікі прэміум-картак просяць забраніраваць нумар у гатэлі, замовіць білет на самалёт і дапамагчы ўзяць напракат аўтамабіль за мяжой. Сярод незвычайных просьбаў — зняць апартаменты ў французскім замку, выбраць пінжак, знайсці ўрача ўначы або разбудзіць раніцай.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Абітурыент-2017

## СТАЦЬ БУДАЎНІКОМ ЯШЧЭ НЕ ПОЗНА

**У дзесяці ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі сталіцы набор навучэнцаў на асобныя спецыяльнасці, якія не ўкамплектаваліся, падоўжаны да 1 верасня.**

Сярод іх Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж швейнай вытворчасці, Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж будаўніцтва, Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва імя М.А. Кедышкі, Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж мантажных і пад'ёмна-транспартных работ, Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж будаўніцтва і камунальнай гаспадаркі, Мінскі дзяржаўны прафесійны ліцэй №7 будаўніцтва, Мінскі дзяржаўны прафесійны ліцэй №9 аўтамабілебудавання, Мінскі дзяржаўны прафесійны ліцэй №12 будаўніцтва, Мінскі дзяржаўны прафесійны ліцэй №13 будаўніцтва і Мінскі дзяржаўны прафесійны ліцэй №3 машынабудавання ■

■ Ведай нашых!

## ГЕАГРАФІЮ — НА «БРОНЗУ»

**Беларуская каманда заваявала дзве «бронзы» на XIII Міжнароднай геаграфічнай алімпіядзе ў Пекіне.**

Спаборніцтвы праводзяцца пад патранажам Міжнароднага геаграфічнага саюза, пачынаючы з 1996 года, і з'яўляюцца важнай часткай працы па папулярызацыі навукі аб навакольным асяроддзі. Да 2012 года алімпіяда арганізоўвалася раз на два гады, а цяпер юныя географы збіраюцца штогод. У алімпіядзе ўдзельнічаюць школьнікі ва ўзросце ад 16 да 19 гадоў — пераможцы аналагічных нацыянальных спаборніцтваў. У рамках алімпіяды прадугледжаны тры асноўныя спаборніцкія этапы — тэарэтычны, палявы і мультымедыйны. Афіцыйная мова IgeoE англійская.

За сваю гісторыю алімпіяда праходзіла ў многіх краінах свету, сярод якіх Нідэрланды, Партугалія, Рэспубліка Карэя, ПАР, Аўстралія, Туніс, Кітай, Германія, Японія, Польшча, Расія. На апошнім міжнародным першынстве ў Кітаі два бронзавыя медалі прынеслі ў скарбонку беларускай школы выпускнік СШ №18 г. Баранавічы Міхаіл Стрэмаус і выпускнік сталічнай гімназіі №22 Арцём Зубрыцкі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# Шасцікласнікі выбіраюць макасіны

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дзмітрый працуе старшым майстрам на Мінскім трактарным заводзе, Галіна — настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў вучылішчы алімпійскага рэзерву.

«На шчасце, у нас не будзе перыяду, калі ўсе трое дзяцей будуць вучыцца ў школе. Малодшая дачка пойдзе ў першы клас, калі старэйшая скончыць адзінаццаты. Інакш невядома, як бы мы справіліся, нават з двума дзецьмі падрыхтоўка да школы — гэта істотная нагрузка на наш сямейны бюджэт, — дзеляцца перажываннямі бацькі. — Хоць гэта толькі здаецца, што ў дзіцячы садок амаль нічога купляць не трэба. Вядома, многія рэчы нам аддаюць сваякі і знаёмыя, але, напрыклад, без абутку не абысціся, а на дзіцячую ножку ён часта каштуе не менш, чым на дарослую.

Дзяржава выдзяляе нам матэрыяльную дапамогу да навучальнага года — 30 працэнтаў ад пражыткавага мінімуму — гэта каля 53 рублёў на кожнага школьніка. Грошы ў прынцыпе не бываюць лішнімі, але гэтай сумы хопіць толькі на канцылярскія прылады», — расказвае Галіна.

У многіх буйных крамах для шматдзетных сем'яў прадугледжаны зніжкі. У ГУМе, напрыклад, — гэта 10 працэнтаў, але тавары павінны быць толькі беларускай вытворчасці, нават сумесныя кампаніі, напрыклад беларуска-расійскія, не падыходзяць. Пералік саміх тавараў абмежаваны: на як ніколі актуальныя зараз канцылярскія прылады зніжка не распаўсюджваецца.

Пошук формы — самае складанае ў падрыхтоўцы да школы. Ужо некалькі дзён сям'я Куноўскіх патраціла на гэты занятак, але пакуль поспех можна назваць няпоўным. Ганне купілі штаны і блузку ў недзяржаўных крамах, Міхаілу — спартыўнае трыко на рынку. У ГУМе вялікая сям'я яшчэ не паспела пабываць, таму ўскладае на ўнівермаг вялікія надзеі.

### Слова — юнаму модніку

Накіроўваемся ў аддзел дзіцячага адзення. Мама адразу ж прыходзіць у «баявую гатоўнасць» і ўжо на ўваходзе паспявае прыкласці да сына (ці пасуе яму колер?) пінжак. Аднак тут настае чарга нам умяшацца: дзеці і бацькі будуць выбіраць убранне асобна адзін ад аднаго. Гэта некалькі бянтэжыць бацькоў, але вельмі радуе дзяцей.

Галоўнай дзеючай асобай становіцца Міша. «Рост — 158 сантыметраў», — паспявае крыкнуць яму наўздагон мама. «Я сам ведаю», — ужо з другога канца залы дзелавіта адказвае ёй сын.

Хлопчык накіроўваецца да стойкі з касцюмамі. «Ён нам за лета ўсе вушы прагудзеў, што хоча сіні пінжак з латкамі на локцях і макасіны да яго», — расказвае Ганна. На пытанне аб тым, чаму менавіта такі выбар, Міхась адказвае, што ў школе ўсе хлопцы так ходзяць і наогул гэта модна і прыгожа. Мабыць і так, але нічога падобнага адшукаць на вешалцы не ўдаецца, таму хлопец спыняецца на цёмна-сінім касцюме (штаны — 21,5 рубля, пінжак — 47 руб.). Далей — кашуля. На стойцы вісяць распакаваныя кашулі ўсяго па некалькі на кожны памер, астатнія — мераць нельга. Узяць даводзіцца самае нейтральнае з таго, што ёсць, — бледна-руковую кашулю (14,3 руб.). Побач з гальштукамі Міхась затрымліваецца: гэты прадмет гардэроба здаецца яму вельмі цікавым — дадае ўзросту і самавітасці. Выбірае ён валошкавы гальштук (9 руб.), які не трэба завязваць, збянтэжана прызнаўшыся, што гэтым навыкам пакуль не авалодаў. Выбар колеру хлопец тлумачыць тым, што сіні — ён і ёсць сіні, незалежна ад адценняў, а значыць, такі гальштук будзе добра спалучацца з касцюмам.

Фота Надзеі БУЖАН.

На цэны Міхаіл увагі не звяртае, адзінае, на што ён паглядзеў, — гэта этыкетка на штанах. І тое, толькі таму, што памятаў іх высокі кошт у папярэдняй краме — тут жа яны, да яго радасці, практычна ў два разы таннейшыя.

Асаблівую ўвагу Міхась надае выбару абутку. Сярод мноства туфляў адразу знаходзіць жаданыя макасіны. Яны нават па колеры такія, якія павінны быць, — сінія! Падвёў толькі памер — на два меншы, чым трэба. А вось у яго 39-м, нягледзячы на старанні прадаўцоў адшукаць, нічога падобнага на макасіны няма. Простыя мадэлі класічных скураных туфляў аказваюцца нязручнымі, таму выбар ён робіць на карысць замшавых 40-га памеру (72,7 руб.). Яны трохі шлёпаюць, але Мішу гэта не бянтэжыць — нага ж расце.

Напрыканцы — школьны партфель. Хлопчык абводзіць асартымент крытычным поглядам: занадта шмат лішніх дэталяў — яны выглядаюць дзіцячымі. Для сябе ён выбірае чыста чорны палатняны заплечнік з псеўдаскуранымі ўстаўкамі (62,2 руб.). На гэтым — вобраз гатовы, прыйшоў час паказацца бацькам.

Касцюм бацькі ўхваляюць. Тата адразу з усмешкай адзначае: «Ён чарнільнага колеру, як у мяне. Думаю, гэта не проста так». Мама незадаволеная гальштукам: ён вельмі дрэннай якасці, маланка адразу ж вырвецца, ды і выглядае танна. Разглядаюць далей. Тата пачынае смяяцца з туфляў: «Яны ж велізарныя і вельмі дарослыя. Ты выглядаеш, як цыганскі барон». А вось маме не да жартаў — яна ўсур'ёз расчараваная выбарам заплечніка: «Ён абавязкова павінен быць са спецыяльнай артапедычнай спінкай, з некалькімі аддзяленнямі. Гэты — не для школы, максімум — прагуляцца па вуліцы».

Выснова. На думку бацькоў з усяго вобраза купіць можна толькі касцюм, а Міхась у такім выглядзе гатовы ісці на ўрачыстую лінейку.

### За справу бяруцца бацькі

Настае чарга бацькоў рабіць свой выбар. Падыходзячы касцюм яны не знаходзяць: «Нам вельмі падабаецца марка Respect, яны робяць дастаткова дарагія касцюмы, затое тыя носяцца мінімум два гады». «Касцюмы дарагія, таму што мадэльны рад мяняецца кожны год, — уступае ў размову прадаўшчыца. — Ды і самі яны адпавядаюць перавагам падлеткаў — прыталеныя пінжакі і завужаныя штаны. Кошт — ад 100 рублёў. У сярэднім жа касцюм іншых марак (самыя распаўсюджаныя — «Славянка», «Камінтэрн») можна купіць за 70-80 рублёў, нядаўна мы прадалі камплект, пінжак і штаны, за 40 — ён вісеў некалькі сезонаў. Дарэчы, школьная форма ў нас прадстаўлена толькі беларускіх вытворцаў».

Бацькі спыняюць свой выбар на штанах (34,3 руб.), да якіх падбіраюць чорную кашулю (16,7 руб.) і чырвоную «бабачку» (3,6 руб.). Дарослыя, вядома, не абмінаюць пытанне цаны, але галоўнае, на што яны звяртаюць увагу, — якасць матэрыялу. «Чорную кашулю ён даўно хацеў. А «бабачкі» цяпер на піку папулярнасці, да таго ж, чырвоны колер павінен прыгожа спалучацца з яго яркімі валасамі. Міша ў нас любіць прыбірацца, але галоўнае яго захапленне — мадэльныя прычоскі, пад машынку падстрыгчыся — гэта зусім не пра яго», — усміхаецца Галіна.

Перабіраемся ў аддзел абутку. Мама больш кансерватыўная ў сваім выбары — класічныя чорныя туфлі без упрыгожванняў (74,8 руб.). «Абутак — гэта тое, на чым я ніколі б не стала эканоміць. І справа зусім не ў прыгажосці, а менавіта ў зручнасці. Ён абавязкова павінен быць з натуральных матэрыялаў, у ідэале — з артапедычнай падэшвай. Дзіцяці ж прыходзіцца хадзіць у ім увесь дзень, а няправільны абутак можа пацягнуць за сабой непапраўныя змены ў паставе. Такая ж пазіцыя ў мяне і ў дачыненні да заплечніка».

Дарэчы, пра яго: асартыментам, прадстаўленым ва ўнівермагу, жанчына незадаволеная. «На самай справе, я б тут нічога не купіла. Але цяпер давайце спынімся на гэтым заплечніку са спінкай, якая добра падтрымлівае, хоць ён і занадта дарагі (130 руб.). На мой погляд, нармальная цана за школьны партфель — не больш за 60 рублёў.

Паказваем выбар бацькоў Міхасю. Ён абураны даўжынёй кашулі (амаль па калена, хоць рост — 158), не надта яму спадабаліся і туфлі. «Мама, навошта на заплечніку сінія ўстаўкі? Ён жа сюды не падыходзіць!» — крытыкуе хлопец. Але потым прызнае, што так з'явіцца ў школу не пасаромеўся б.

Выснова. З двух варыянтаў Міхась усё ж такі аддае перавагу свайму выбару, бацькі згаджаюцца з тым, што касцюм нядрэнны і яго можна браць. А вось Ганна, наадварот, цалкам ухваляе выбар бацькоў.

• **Да ведама**

У новым сезоне «Беллегпрам» прадаставіў магчымасць школьнікам і іх бацькам выбіраць адзенне з больш чым 500 мадэляў у дзелавым стылі і 300 мадэляў вырабаў з трыкатажу. Пры гэтым шмат не толькі мадэляў, але і саміх элементаў адзення: дзяўчынкі змогуць сабраць школьны гардэроб па душы з касцюмаў, камплектаў, сарафанаў, сукенак, спадніц, штаноў, жакетаў, камізэлек і розных відаў блуз. Хлопчыкам на выбар прапанаваны касцюмы, пінжакамі, камплекты, камізэлькі, штаны, якія можна дапоўніць адпаведнымі ім сарочкамі, джэмперамі і гальштукамі. Адметна, што ўсе калекцыі створаны практычна з нуля: абнаўленне ў дачыненні да мінулага года склала 90 працэнтаў.

Прадпрыемствы канцэрна — асноўныя пастаўшчыкі не толькі адзення, а і абутку для школьнікаў. Абнаўляльнасць у гэтай галіне меншая — 50 працэнтаў штогод, да будучага навучальнага прадстаўлена 300 мадэляў абутку.

Акрамя таго канцэрн удзельнічае ў праграме «Школа будучыні», згодна з якой некаторыя навучальныя ўстановы заказваюць у прадпрыемстваў легпрама вопратку і абутак у аднолькавым для ўсіх выкананні. Па словах прэс-сакратара канцэрна Наталлі КРАЎЦОВАЙ, паступова ў Беларусі мы павінны прыйсці да школьнай формы, якая будзе несці сэнсавую нагрузку: адрозніваць не толькі асобныя школы, але і вылучаць вучняў малодшых, сярэдніх і старшых класаў.

Цалкам сабраць у школу вучня малодшых класаў будзе каштаваць ад 150 да 690 рублёў, старшакласніка трохі даражэй — ад 200 да 850 рублёў. Цана залежыць ад класа: бізнес або эканом. Для дзяўчат адзін камплект бізнес-класа каштуе 50-80 рублёў, эканом — да 45 рублёў; для хлопцаў касцюм бізнес-класа абыдзецца ў 90-135 рублёў, эканом — 50-80. Для школьнікаў, якія адпавядаюць дарослым параметрам, вопратку таксама трэба шукаць у дарослым аддзеле. Перад пачаткам навучальнага года там падрыхтаваны стойкі з адзеннем у дзелавым стылі.

Як адзначыла Наталля Краўцова, сапраўднай «бомбай» у гэтым сезоне стала калекцыя для дзяўчынак у рэтра-стылі ад прадпрыемства «Славянка». Цёмна-сінія і карычневыя сукенкі спадабаліся школьніцам усіх узростаў.

Масавы продаж тавараў для школьнікаў па ўсёй краіне будзе працягвацца да 10 верасня.

### Вялікім кірмашам і сайтам — не, універмагам і сэканд-хэндам — так?

Цяпер уся ўвага пераходзіць на Ганну. У дзіцячым аддзеле на дзяўчынку ростам 172 см ужо даўно амаль нічога няма. Вось і цяпер некалькі прапанаваных рэчаў падыдуць хутчэй сакратару, чым школьніцы. Накіроўваемся ў дарослы аддзел. Дзіўна, але мама і дачка адразу звяртаюць увагу на адну і тую ж сукенку: крыху вышэй калена, чорная ў белыя гарошкі з адкладным каўнерыкам. «Мы абавязкова прыйдзем сюды ў дзень зніжак, — па-змоўніцку падміргвае мне Галіна. — Сапраўды, гэта самы складаны перыяд для выбару адзення — дзяўчынка пасля 7 класа. Хлопца апрануць усё ж значна прасцей. А прыемней за ўсё падбіраць адзенне малодшакласнікам, асабліва дзяўчынкам. Для іх робяць вельмі прыгожыя рэчы і выбар сапраўды велізарны. Я ўжо прадчуваю, як мы будзем збіраць у першы клас Ксенію.

Вялікія школьныя кірмашы Галіна не любіць: там занадта шмат народу, таўкучка і немагчыма засяродзіцца. Абсалютна спакойна ставіцца да сэканд-хэнду: якасныя ношаныя рэчы значна прыемней браць у рукі, чым новыя, выкананыя з сінтэтычных матэрыялаў. Сайтам у інтэрнэце наша гераіня не давярае: ёй трэба ўсё ўважліва разгледзець і памацаць.

«Думаю, дызайнерам нашых прадпрыемстваў варта праводзіць апытанні сярод школьнікаў, каб высветліць, якой яны бачаць сваю школьную форму. Нават наш эксперымент паказаў, што дзеці часам лепш за дарослых ведаюць, што ім сапраўды падыходзіць», — разважае Галіна.

На пытанне аб тым, як бы яны хадзілі ў школу, калі б не былі абмежаваныя ў выбары, дзеці адказваюць па-рознаму. Ганна аддае перавагу школьнай форме, таму што, на яе думку, гэта сапраўды прыгожа. А вось Міша хацеў бы хадзіць у джынсах і кашулях: яму здаецца, што гэта стыльна. «Але дзяўчынкі павінны хадзіць у школу ў сукенках і спадніцах. Джынсы не для іх, яны толькі псуюць вобраз», — сур'ёзна падводзіць вынік хлопчык.

З універмага мы сышлі без пакупак, але з абяцаннем вярнуцца: у наступныя дні сям'і Куноўскіх належыць здзейсніць яшчэ адзін (а можа і не адзін?) «забег» па крамах у пошуках ідэальнай формы, якая нарэшце спадабаецца ўсім: і дзецям, і бацькам.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ А як у рэгіёнах?

# ПАДРЫХТОЎКУ ПАЧАЛІ Ў СЯРЭДЗІНЕ ЛЕТА

Надзея і Павел ГУРЫНЫ.

У сям'і Валянціны і Мікалая Гурыных з Жабінкі растуць чацвёра дзяцей. Двое з іх — школьнікі, а двое — ва ўзросце да трох гадоў. Надзея першага верасня пойдзе ў другі клас, Павел — у трэці.

Паводле слоў мамы Валянціны Міхайлаўны, займацца падрыхтоўкай школьнікаў Гурыны пачалі ў сярэдзіне лета. Адзенне для дзяцей сям'я набывае ў асноўным у Кобрыне. Так склалася даўно, у тамтэйшых магазінах асартымент шырокі, цэны больш прымальныя. Таму нават у справе выбару паміж Брэстам і Кобрынам бацькі аддаюць перавагу суседняму райцэнтру.

Летам старэйшыя дзеці адпачывалі ў лагеры, таму спартыўную форму, абутак для заняткаў фізкультурай ім купілі загадзя. А ў Надзі, якая не нашмат вырасла, адзенне засталося з першага класа яшчэ на год. Такім чынам, апраналі цяпер толькі Паўла. На экіпіроўку вучня трэцяга класа пайшло 200 новых рублёў.

Акрамя таго дзецям засталося купіць усё неабходнае для заняткаў спортам, у гуртках па інтарэсах. Павел займаецца плаваннем, а, напрыклад, адны акуляры каштуюць 25 рублёў. Калі гаворка ідзе не пра басейн на ўроках фізкультуры, а пра сур'ёзныя заняткі спортам, то сума набягае значная, заўважае Валянціна. Ну і Надзейцы патрэбна ўсё неабходнае для заняткаў танцамі.

— Што датычыць сшыткаў, паперы, алоўкаў, іншых канцылярскіх прылад, то ў нас ёсць «чароўная шуфлядка» — расказвае мама вучняў. — Што гэта значыць? Нехта прыходзіць у госці з падарункамі, нешта купляецца цягам года і застаецца нявыкарыстаным. Рэчы не раскідваюцца абы як, а складваюцца ў адмысловую шуфлядку, каб да першага верасня сшыткі, алоўкі, фламастары захаваліся як новыя. Такім чынам у дзяцей выхоўваецца акуратнасць, беражлівасць з самага ранняга ўзросту. У гэтай шуфлядзе хопіць акурат на пачатак, а то і на першую палову навучальнага года.

А на прадметныя сшыткі, вучэбныя дапаможнікі мы здавалі грошы яшчэ ў маі, — працягвае аповед Валянціна. — Думаю, што гэта найлепшы варыянт, каб не траціць грошы на ўсё адразу. Што датычыць дапамогі, мы, як шматдзетная сям'я, атрымалі 80 рублёў на дваіх дзяцей ад дзяржавы. Акрамя таго мужу на працы далі матэрыяльную дапамогу менавіта на падрыхтоўку дзяцей да школы.

Валянціна Гурына расказала, што ў шматдзетнай сям'і ўсе расходы плануюцца загадзя, інакш нельга, таму заўсёды на ўсё мусіць хапаць грошай. Падрыхтоўку да школы бацькі з Жабінкі бачаць не толькі ў тым каб апрануць-абуць дзяцей, але і спрыяць іх развіццю. Так што летась яны ўсе разам наведалі Мір, Нясвіж, Ружаны, сёлета таксама ўдалося пазнаёміцца з шэрагам гарадоў Беларусі. Такім чынам да школы Надзя і Павел Гурыны гатовыя.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*
*Жабінкаўскі раён.*

# Не хапае толькі школьнай формы для акселератаў

**На самым буйным у Магілёве школьным базары каля гандлёвага цэнтра Парк-сіці ў Казіміраўцы сёння шматлюдна. Канцтавары, адзенне і абутак для дзяцей і падлеткаў, у тым ліку дзелавога стылю, сумкі, партфелі, школьна-пісьмовыя прылады, кнігі, навучальныя дапаможнікі — тавары на любы густ і кашалёк. Сваю прадукцыю з 10 раніцы да паловы восьмай вечара па буднях і да 18.00 у выхадныя дні тут прапаноўваюць каля 70 суб'ектаў гандлю. А ўсяго да паслуг жыхароў Магілёўскай вобласці, якія збіраюць дзяцей у школу, сёння працуе 75 школьных базараў, з якіх 23 пастаянна, астатнія — у выхадныя дні.**

Прадпрыемствы адказна падышлі да падрыхтоўкі да школьнага сезона. Напрыклад, толькі бабруйская «Славянка» сёлета прапаноўвае каля 50 мадэляў школьнага адзення. Гэта той самы вытворца, які смела эксперыментуе ў сучасных умовах і прапануе кожны раз нешта новае. Менавіта гэта фабрыка адной з першых у краіне пачала выпускаць касцюмы для школьнікаў з кішэнямі для мабільнікаў, якія за кошт спецыяльнай тканіны затрымліваюць электрамагнітнае выпраменьванне. Піск цяперашняга сезона — мадэрнізаваная рэтра-форма савецкіх часоў. Як кажа **дырэктар прадпрыемства Тэймураз БАЧАРЫШВІЛІ,** заказ быў атрыманы ад некалькіх навучальных устаноў горада Барысава. Камплекты з чорнымі і белымі фартухамі, з каўнярамі, якія аднашпільваюцца, сапраўды выглядаюць вельмі прыгожа і элегантна. Шыюць тут касцюмы і для хлопчыкаў-акселератаў 2, 3 і нават 4 паўнаты. Але дэфіцыт адзення для поўных дзяцей усё роўна адчуваецца.

Галіна, маці 12-гадовага Максіма, пакуль вывучае асартымент. Уздыхае, што знайсці варыянт, які падыходзіў бы для яе сына, нават пры такой разнастайнасці праблематычна. Хлопчык пойдзе ў 7 клас, але рост у яго 170 сантыметраў, а памер 54. Мяркуе, што замест дзелавога касцюма прыйдзецца купляць штаны і пінжак асобна, прычым у аддзеле для дарослых мужчын. У выніку камплект з кашуляй пацягне прыкладна на 200 рублёў. Туфлі маці разлічвае купіць за суму ў межах 60-80 рублёў. Сумка, у залежнасці ад формы і матэрыялу, можа абысціся ў 27-70 рублёў. А яшчэ патрэбны красоўкі, спартыўны касцюм. Плюс усе астатнія школьныя «дробязі» ў выглядзе сшыткаў, канцтавараў і іншых неабходных для вучэбнага працэсу рэчаў.

Таццяна Глазкова, настаўніца, збірае ў школу траіх дзяцей — сына-другакласніка і дачок дзевяці- і дзесяцікласніцу. Асноўныя закупкі яшчэ наперадзе, але грошы на самае неабходнае ўжо ёсць. Болей чым 150 рублёў выдзелена па месцы вучобы дзяцей, па 7 базавых велічынь на кожнага школьніка пералічылі маці па месцы яе працы ў школе №34, плюс дапамогу акажа прафкам таксама па месцы працы.

— Гэта вельмі добрая падтрымка, — кажа шматдзетная маці. — Мы выходзім з таго, што на кожнага нашага вучня прыйдзецца патраціць каля 200-300 рублёў. Гэта прыкладна столькі, колькі нам выдзелена дапамогі. Усім, у тым ліку дзяўчатам, збіраемся купіць штаны (можна будзе сэканоміць на калготках), абутак, па некалькі белых кашуль на кожнага, а таксама спартыўныя касцюмы сыну і адной з дачок, бо леташні стаў ёй крыху малы ў плячах.

Па словах Таццяны, ад вялікіх выдаткаў іх ратуе толькі тое, што дочкі пагодкі. Некаторыя рэчы старэйшай, якая сёлета паступіла ў вышэйшую ўстанову, засталіся ў спадчыну малодшым. А яшчэ сям'я адсочвае зніжкі ў крамах. Напрыклад, атрымалася за паўцаны — усяго за 33 рублі — купіць старэйшай дачцэ туфлі. Там жа зніжкі для тых, хто купляе некалькі пар абутку запар.

— Наогул цэны на рэчы не вельмі адрозніваюцца ад леташніх, — з веданнем справы кажа маці. — Вось на што прыйдзецца патраціцца, дык гэта на метадычную літаратуру. Рабочыя сшыткі каштуюць прыкладна 3,5-4 рублі адзін, а іх трэба купіць па кожным прадмеце.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# Краіна здароўя

Выпуск №14 (367)

■ Асаблівасці захворвання

## ГЕПАТЫТ НЕ ДРЭМЛЕ, АЛЕ І МЫ НЕ СПІМ

**Элементарныя правілы гігіены і вакцынацыя павінны засцерагчы ад самых распаўсюджаных відаў гепатыту — А, В і С**

«Падхапіць» вірусныя гепатыты В і С даволі проста — яны перадаюцца праз невялікую колькасць крыві, і гэта не абавязкова ін'екцыйнае ўжыванне наркотыкаў і сексуальныя кантакты. Чысціць зубы чужой шчоткай, расчэсваць валасы чужой расчоскай дакладна не варта: уладальнік гэтых прылад і сам можа не ведаць, што з'яўляецца носьбітам захворвання. Наогул, чым больш рызыкоўныя паводзіны вы практыкуеце, тым большая верагоднасць заразіцца. Ужыванне любых наркотыкаў (не абавязкова ін'екцыйных), злоўжыванне алкаголем — усё, што дапамагае нам страчваць кантроль, прыводзіць да рызыкоўных паводзінаў (тут і бойкі, і выпадковыя палавыя сувязі). Што датычыцца гепатыту А, то ён трапляе ў арганізм з забруджанай вадой або прадуктамі, што магчыма, у першую чаргу, у трэціх краінах з нізкім узроўнем жыцця, медыцыны і санэпіднагляду. А таму заўсёды будзьце ўважлівымі да свайго рацыёну, асабліва падчас замежных вандровак.

Супраць гепатытаў А і В у нашай краіне праводзіцца вакцынацыя немаўлят, што забяспечвае ім у далейшым стапрацэнтную абарону. Аднак гепатыт С застаецца для вучоных сур'ёзнай праблемай — ён надта зменлівы, каб вынайсці такую абарону. Ратуюць толькі эфектыўныя схемы лячэння.



Праўда, гепатыт В, калі ўжо трапляе ў арганізм, то застаецца там на ўсё жыццё — лячэнне толькі дапамагае зрабіць так, каб ён не аказваў шкоднага ўздзеяння на здароўе.

Вірусныя гепатыты В і С вельмі часта могуць працякаць бессімптомна, і толькі падчас абследаванняў можна выявіць антыгены, якія сведчаць за тое, што некалі арганізм з імі пазнаёміўся. У краіне выяўлена каля 40 тысяч пацыентаў з віруснымі хранічнымі гепатытамі В і С. Сусветная арганізацыя аховы здароўя сцвярджае, што толькі 5 працэнтаў інфіцыраваных ведаюць пра свой дыягназ. Аднак нашы спецыялісты сцвярджаюць, што дзякуючы скрынінгу груп рызыкі сітуацыя нашмат у Беларусі лепшая. 17 катэгорый грамадзян, напрыклад цяжарныя, усе, хто пражывае з такімі хворымі, хто знаходзіцца на гемадыялізе і г.д., абавязкова абследуюцца на вірусныя гепатыты.

А ўсё таму, што вострая форма захворвання даволі хутка пераходзіць у хранічную, а гэта паступова можа значна пашкодзіць печань, абумовіць развіццё цырозу і раку. Праўда, у пэўнай частцы вострых выпадкаў гепатыту С назіраецца самавылечванне. Ды і калі выявіць захворванне ў вострай форме, сучасныя схемы лячэння даюць добры эфект. «У краіне зарэгістраваны шэраг прэпаратаў, якія дазваляюць пазбавіцца ад самага распаўсюджанага сярод вірусаў гепатыту — С, — тлумачыць **намеснік галоўнага ўрача Мінскай гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы г. Мінска Святаслаў ВЕЛЬГІН**. — Першую ін'екцыю пацыент атрымлівае ў стацыянары, дзе даследуюцца пабочныя рэакцыі, а далей прызначаецца курс лячэння працягласцю ад паўгода да года. У свеце ўжо прымяняюцца новыя прэпараты з меншымі пабочнымі эфектамі і большай эфектыўнасцю. Некаторыя з іх ёсць і ў нашай аптэчнай сетцы. Акрамя таго, зарэгістраваны і пачнуць да канца года выпускацца яшчэ два прэпараты супраць гепатытаў В і С».

### Гэта важна

✓ Любая працэдура, звязаная з пашкоджаннем скуры — пірсінг, тату, лячэнне зубоў, стрыжка ў цырульні, — з'яўляюцца патэнцыйнай пагрозай. Аднак рызыка становіцца мінімальнай, калі ўсё гэта рабіць у афіцыйных установах, дзе працуюць спецыялісты з адпаведнай адукацыяй, праводзіцца адпаведны санітарны нагляд, робіцца ўсё неабходнае для прафілактыкі заражэння (аднаразовыя пальчаткі, аднаразовы інструментарый, гігіена рук, прыборка). Па сутнасці, кожны павінен паводзіць сябе з улікам патэнцыйнай небяспекі, а сам інфіцыраваны — памятаць аб адказнасці за наўмыснае заражэнне.

✓ З асцярожнасцю трэба паводзіць сябе не толькі ў азіяцкіх краінах, але нават у еўрапейскіх. Праблема гепатытаў будзе захоўваць сваю актуальнасць там, дзе шырока ўжываюць любыя наркарэчывы і дзе распаўсюджаны аднаполыя шлюбы.

✓ Леташняе апытанне захварэлых паказала, што 20 працэнтаў маглі, на іх думку, заразіцца праз палавы кантакт; 11 працэнтаў звязваюць магчымасць інфіцыравання вірусным гепатытам з ін'екцыйным ужываннем наркотыкаў; 9 працэнтаў — з пэўнымі маніпуляцыямі кшталту наведвання цырульні; 2,5 працэнта — з выпадковым пашкоджаннем скуры (кантактна-бытавы шлях).

■ Парады для кожнага

# ШТО З СЭРЦАМ?

**Захворванні сістэмы кровазвароту па-ранейшаму лідзіруюць у структуры смяротнасці — 51—55 працэнтаў выпадкаў гібелі маюць у аснове гэту прычыну. Што рабіць, каб мы жылі як мага даўжэй без падобных праблем, і чым медыцына здольная дапамагчы ў выпадку іх узнікнення? Расказвае дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Аляксандр МРОЧАК.**

### Будзе яшчэ больш?

— У шэрагу заходніх краін працэнт смяротнасці ад захворванняў сістэмы кровазвароту меншы, але там інакш складаецца статыстыка. Так, у ЗША 18 працэнтаў усіх выпадкаў смерці насельніцтва звязваецца з цукровым дыябетам. У нас — 3 працэнты. Бо хворыя на цукровы дыябет гінуць менавіта ад сардэчна-сасудзістай паталогіі.

**Сімптом вельмі просты — боль за грудзінай, які не спыняецца. Здаецца, толькі пазвані. Не, чакаюць або панядзелка, або калі само пройдзе...**

Ад хвароб сістэмы кровазвароту ў нашай краіне пакутуюць 2 млн 470 тысяч чалавек. Гэта 26 працэнтаў ад усяго насельніцтва, або 32 ад дарослага. Наогул захворванні сэрца і сасудаў наўпрост звязаныя з узростам. Мы сёння намагаемся павялічыць сярэднюю працягласць жыцця да 75 гадоў, а таму заканамерна павінны чакаць і росту такой паталогіі. І быць гатовымі да аказання дапамогі такім пацыентам.

### Лідары па курэнні?

— Калі б насельніцтва нашага абласнога горада кінула курыць, то колькасць выклікаў «хуткай дапамогі» зменшылася б там на 15 працэнтаў. Менш стала б востраг каранарнага сіндрому, гіпертанічных крызаў... Хто ў нас не ведае, што курыць дрэнна, але мы ўсё роўна застаёмся адной з самых тытунёвазалежных краін. Ампутацыі ў хворых на цукровы дыябет, якія кураць, здараюцца ў 5 разоў часцей. Анкалогія розных формаў, не толькі рак лёгкага, — таксама ў разы часцей. Я агрэсіўны ў дачыненні да курэння. Таму што клінічная медыцына стала вельмі дарагой...

### Па сацыяльных прычынах?

**— Важную ролю ў развіцці сардэчна-сасудзістых захворванняў адыгрывае сацыяльны фактар — урбанізацыя, працоўная занятасць, палітычная сітуацыя. Скажам, пасля распаду Савецкага Саюза адбыўся ўсплёск такой захваральнасці ва ўсіх яго краінах, у тым ліку ў Беларусі...**

У нашым цэнтры сёння робіцца практычна ўсё, што выконваецца ў свеце, але ўсе гэтыя складаныя ўмяшанні — работа з хворым чалавекам. Яму патрэбна ўжо толькі другасная прафілактыка... А як зрабіць, каб гэты чалавек не захварэў, каб ён не курыў? Патрэбны не забаронныя меры, а комплексны падыход, без папулярызацыі шкодных звычак. Вазьміце некаторыя папулярныя серыялы: палічыце, колькі там выпіваюць! Нам жа патрэбна фарміраваць іншы стэрэатып: чым менш у мяне фактараў рызыкі, тым больш я буду працаваць, атрымліваць матэрыяльных выгод, даўжэй буду жыць... Вядома, што Форд штрафаваў сваіх работнікаў-курцоў і аддаваў грошы тым, хто не курыць. Неблагая матывацыя!

### Лішак алкаголю — раптоўная смерць?

— Спажыванне алкаголю — таксама істотны фактар рызыкі абвастрэння працякання сардэчна-сасудзістага захворвання. Калі мы хочам атрымаць часцей раптоўную сардэчную смерць (а гэта сёння 20 працэнтаў ад усіх выпадкаў гібелі ад сардэчна-сасудзістай паталогіі), то можна працягваць злоўжываць у тых жа аб'ёмах. Урачы ўжо даўно кажуць пра «святочнае сэрца» — тая ж «хуткая» выклікаецца часцей менавіта ў дні свят.

Калі ў вас ёсць артэрыяльная гіпертэнзія і вы злоўжываеце, значыць вы паскараеце наступленне гіпертанічнага крызу, інсульту. Калі ў вас арытмія, то на высокай дозе алкаголю можа быць раптоўная смерць.

### А нармальнага ціску не дасягаем?

— Пацыенты з артэрыяльнай гіпертэнзіяй сёння досыць актыўна бяруцца на ўлік, але што далей? Аналіз медыцынскіх картак асоб, якія знаходзяцца на дыспансерным уліку з такім захворваннем, паказвае, што 87 працэнтаў пацыентаў інфармаваныя аб наяўнасці ў іх фактараў рызыкі развіцця той жа гіпертэнзіі, 64 працэнты з іх штодня прымаюць адпаведнае лячэнне, але дасягаюць мэтавага ўзроўню (прымаюць так, каб ціск быў нармальным) усяго 30 працэнтаў! Чалавек ведае аб сваёй праблеме, але не хоча лячыцца, а калі хоча і лечыцца, то робіць гэта няякасна. А гэта што ў перспектыве? Інсульты і інфаркты.

### Можа, лекі не тыя?

— Мы сёння працуем паводле доказнай медыцыны. Гэта азначае, што прэпараты, якія выкарыстоўваюцца, даказалі сваю эфектыўнасць і бяспеку. Прайшлі маштабныя, складаныя, незалежныя даследаванні. Калі вы хочаце атрымаць эфект, значыць павінны карыстацца менавіта такімі прэпаратамі.

Наогул псіхалагічны фактар у фармакатэрапіі адыгрывае важную ролю. Можна па-рознаму прызначаць прэпараты. Як вы думаеце, з якімі думкамі будзе лячыцца пацыент, калі яму сказаць: «Ведаеце, яшчэ нікому не дапамагала, але паспрабуйце»?

### Як дапамагчы пры інфаркце?

— Ці можам мы дапамагчы чалавеку з вострым інфарктам міякарда? Можам! Пачынаючы з 2011 года мы ўкаранілі практыку выкарыстання ангіёграфаў — апаратаў, якія дазваляюць паглядзець стан сасудаў, увайсці ў сасуд, які аказаўся закрытым і дзе з гэтай прычыны пачаў развівацца інфаркт, аднавіць кровазабеспячэнне і прадухіліць ускладненні. Калі гэтага не зрабіць, то разаўецца інфаркт. Ад дыяметра сасуда залежыць, якая плошча міякарда загіне: калі ён буйны — вялікая, а значыць, гэта рубец, які абмяжуе здольнасць сэрца нармальна скарачацца, што справакуе небяспечную для жыцця арытмію і сардэчную недастатковасць.

У нас ёсць прыкладна 1 гадзіна для таго, каб прадухіліць увесь гэты небяспечны ланцуг. У Мінску гэта цалкам рэальна, бо працуюць пяць цэнтраў для правядзення такога абследавання. Ёсць ангіёграфы і ў абласных гарадах, паступова ствараюцца яны і ў іншых буйных гарадах. Але што мы бачым сёння з боку саміх пацыентаў? У першыя 6 гадзін развіцця вострага каранарнага сіндрому пазванілі ў «хуткую» ўсяго 55 працэнтаў хворых! Значыць, хворыя нашы трываюць, не ведаюць! А сімптом вельмі просты — боль за грудзінай, які не спыняецца. Здаецца, толькі пазвані. Не, чакаюць або панядзелка, або калі само пройдзе...

### Што трэба рабіць?

— Фактары рызыкі развіцця сардэчна-сасудзістай паталогіі і гібелі ад яе ўсім добра вядомыя. Для мужчын гэта на першым месцы алкаголь, затым тытунь, павышаны артэрыяльны ціск, высокі ўзровень халестэрыну, высокі індэкс масы цела, недастатковае ўжыванне садавіны і гародніны, недастатковая фізічная актыўнасць. Для жанчын — павышаны артэрыяльны ціск, высокі ўзровень халестэрыну, высокі індэкс масы цела, недастатковае ўжыванне фруктаў і гародніны, нізкая фізічная актыўнасць, алкаголь.

САА3 рэкамендуе для прафілактыкі большасці сардэчна-сасудзістых захворванняў:

1. Кантраляваць артэрыяльны ціск і ўзровень халестэрыну.
2. Наладзіць рацыянальнае харчаванне і не набіраць вагу.
3. Займацца фізічнай культурай.
4. Не пачынаць курыць або тэрмінова кінуць.
5. Абмежаваць алкаголь.
6. Вучыцца перамагаць стрэсы.

### Якія яны — сучасныя аперацыі?

— Мы назапашваем вопыт пастаноўкі клапана ў сэрца праз артэрыю або вену. Без разрэзаў. Развіццё інтэрвенцыйных тэхналогій адбываецца неверагодна хутка. Але гэтым займаюцца не кардыяхірургі, а рэнтгенэндаваскулярныя хірургі. Яны лечаць востры інфаркт з дапамогай пастаноўкі стэнта ў пераркрыты сасуд. Праз вену і артэрыю яны маніпулююць, што называецца, ва ўсім сэрцы. Раней для аператыўнага лячэння анеўрызмы аорты трэба было рабіць вялікі разрэз. Дый сама аперацыя да 8 гадзін магла цягнуцца. А сёння праблема вырашаецца шляхам умацавання аорты праз артэрыю. І аперацыйнай раны няма. Можна, напрыклад, знайсці ў сэрцы ачаг, які правакуе парушэнне рытму, дабрацца да яго праз артэрыю або вену і «прыпячы» высокай тэмпературай. Усё гэта абсалютна новыя напрамкі. Гэта прынцыпова іншая падрыхтоўка спецыялістаў

■

■ Медыцынскі турызм

## На які наш санаторый не шкада патраціць немалыя грошы?

# ЛЕГЕНДА ВОЗЕРА ПЛІСА

Фота Алеся ШАРШНЁВАЙ.

**Літаральна месяц таму ў Глыбоцкім раёне Віцебскай вобласці адкрыўся санаторна-курортны комплекс «Пліса», кошт пражывання ў якім на чалавека — ад 55 долараў за суткі. Новы санаторый размясціўся за 180 км ад Мінска і трапіў у пяцёрку самых дарагіх устаноў для аздараўлення. Можа, дарэмна? Разбіраліся журналісты, запрошаныя на экскурсію Нацыянальным прэс-цэнтрам.**

Санаторый з'явіўся на месцы былой вайсковай часці, непасрэдна на беразе ляснога возера Пліса (7 км на 1,5 км), непадалёк ад вёскі з аднайменнай назвай. Вада чыстая, ёсць рыба — лешч, лінь, вугор, шчупак, судак. Буйкі даволі блізка, і там ужо істотная глыбіня. Пляж дагледжаны, уладкаваны, з асінавым насцілам для прыняцця сонечных ваннаў, ёсць і парасоны, тапчаны. Адыходзім ад пляжа ў напрамку пірса. Не жадаеце пракаціцца? На катамаране — 4 рублі за гадзіну, на лодцы — 3, на катары — 10 рублёў за 10 хвілін, і гэтага хопіць, каб пабачыць невялічкія астраўкі, раскіданыя па вадзе як велізарныя зялёныя букеты. Налета плануецца пашырыць парк водных сродкаў перамяшчэння — байдаркі, каноэ, яхта. Не ўмееце гэтым кіраваць? Інструктар навучыць.

Падзялілася Пліса з людзьмі і сваімі лекавымі гразямі. Скарб здабываюць і адразу пускаюць у справу — на лячэнне захворванняў мышачна-касцявой сістэмы. Куды больш эфектыўна, чым тая сыравіна, што завозіцца ў краіну здалёк...

Ідзём ад возера па выкладзенай пліткай сцяжынцы... у бювет, дзе тройчы на дзень рэкамендуецца піць натуральную мінеральную ваду. На смак нязвыкла, але карысна для страўнікава-кішачнага тракту і нармалізацыі функцыі нырак. Наогул на тэрыторыі санаторыя — дзве свідравіны з мінеральнай вадой. Ёсць яшчэ вада з высокай канцэнтрацыяй брому для вонкавага прымянення, што рэдкасць на нашых тэрыторыях (самы блізкі аналаг — у Юрмале). Бромістыя воды карысныя ў выглядзе ваннаў для аздараўлення органаў кровазвароту, нервовай і мочапалавой сістэмы. Ёсць і свая крыніца здабывання лячэбнай сапрапелевай гразі.

Перад намі — аб'ект недзяржаўны. Узвядзеннем займаўся «Трэст Прамбуд», які прыцягнуў значную долю крэдытных сродкаў. Усяго за некалькі гадоў работ было асвоена каля 20 мільёнаў долараў. Трэст заваяваў сабе сур'ёзную рэпутацыю на аб'ектах элітнага жылля, узвядзенні храма-помніка ў гонар Усіх Святых...

Галоўны корпус санаторыя з вышыні птушынага палёту паўтарае, дарэчы, Крыж Еўфрасінні Полацкай. А калі апусціцца ўніз, то паміж прыгожымі клумбамі і дэкаратыўнымі масткамі ўбачым і капліцу ў яе гонар. Хіба магло быць інакш на зямлі, дзе знаходзяцца Полацкі Сафійскі сабор і Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр — усяго за 70 км ад вёскі Пліса.

Санаторна-курортны комплекс пабудаваны ў палацава-паркавым стылі. І стрымана, і велічна, і цалкам арганічна для тутэйшых мясцін. Перад галоўным корпусам — фантан з кампазіцыяй «дзяўчынка і матылькі». У самым цэнтры гэтага корпуса — круглае памяшканне, светлае і ўрачыстае, з велізарнымі хрустальнымі люстрамі, якія каскадам спускаюцца з пяціпавярховай вышыні. Гэта рэсепшн, дзе можна пасля папярэдняга браніравання хутка аформіцца і аплаціць пуцёўку. Калі ехаць з Мінска, то 2,5 гадзіны — і вы на месцы (машыну можна пакінуць на бясплатнай паркоўцы).

— Аднапакаёвы стандарт — з добрай сучаснай мэбляй (ложак, шафа, пісьмовы стол, крэсла), кандыцыянерам, тэлевізарам, тэлефонам з гарадской і міжнароднай сувяззю, фенам і гігіенічнымі сродкамі ў ванным пакоі, плошчай 15 кв. м каштуе 110,5 рубля за суткі на чалавека (да любой сумы трэба дабаўляць 5 працэнтаў курортнага збору). Двухмесныя нумары на дваіх — 205-240 рублёў. Ёсць і апартаменты: у двухпавярховым катэджы — з двюма спальнямі, асобнымі ваннымі пакоямі, гасцёўняй, кабінетам і кухняй (такіх катэджаў пяць) або аднапавярховыя, у якіх дапускаецца размяшчэнне да шасці чалавек, — тлумачыць першы намеснік генеральнага дырэктара «Трэст Прамбуд» Валерый МАЗОЎКА.

На ложках — халаты і ручнікі, у шафах — тапачкі. Усюды ёсць кандыцыянеры, тэлевізары і вельмі добры Wi-Fi — такі, што можна не адрывацца ад любімых сетак нават на пляжы.

Трохразовае харчаванне — на ўзор шведскага стала, гатуюць смачна, хоць выбар страў і фруктаў пакуль небязмежны. Няма і сейфаў, але калі прыехаць толькі з пластыкавай карткай, то не прагадаеш: у галоўным корпусе ёсць аддзяленне аднаго з банкаў.

Бар — прасторны, частка столікаў размяшчаецца на вуліцы, так што ў добрае надвор'е можна ўзяць кавы або чагосьці мацнейшага і атрымаць асалоду на свежым паветры, разглядаючы азёрную прыгажосць.

Тэлебачанне багатае на колькасць каналаў, але, як на маю думку, то лепей больш часу прысвяціць шпацырам па сцяжынцы здароўя ды спартыўным забавам — ёсць пляцоўкі для гульні ў вялікі тэніс, валейбол, футбол, хутка дабавяцца і некалькі вулічных трэнажораў. Непадалёк — гульнявы комплекс для дзяцей. Ракеткі для настольнага тэніса, дартс, набор для «гарадкоў» выдаюцца бясплатна. Тэнісны корт каштуе 15 рублёў за гадзіну, веласіпед — 3, палкі для скандынаўскай хады — 1,5 рубля за гадзіну (інструктар дапаможа разабрацца, што і як рабіць правільна).

У кошт пуцёўкі ўключаны і базавы камплект аздараўленчых працэдур. Можна аплачваць штосьці і дадаткова. Але больш за тры-чатыры працэдуры ў дзень праходзіць не рэкамендуецца.

— Мы ставім перад сабой задачу навучыць людзей правільна харчавацца, адпачываць і аздараўляцца — у гэтым маюць патрэбу абсалютна ўсе, — кажа галоўны ўрач санаторнага комплексу Сяргей ПЕТУХОЎ. — А такое магчыма менавіта ў сваёй роднай кліматычнай зоне, дзе няма дадатковага стрэсу з-за адаптацыі...

У кошт пуцёвак уваходзіць наведванне аквазоны. Праз дзень чаргуюцца працэдуры з мінеральнай вадой і гразі. Плюс штодня адна фізіяпрацэдура, праз дзень — масаж па 15 хвілін, трэнажорная або фітнес-зала.

Тры паверхі ў галоўным корпусе — цалкам лячэбныя. Першы і другі — водагразелячэбніца. Вось тут і накладваюцца гразевыя аплікацыі на хворыя суставы, прымаюцца лячэбныя ванны з мінеральнай вадой, бішафітам, валяр'янай, развадныя гразевыя (гразі разводзяцца мінеральнай вадой). Сухая вуглякіслая ванна — карысны стрэс для дробных сасудаў, што паляпшае ў выніку кровазварот, аздараўляе скуру і забяспечвае антыцэлюлітны эфект. Спецыяльная ванна — для гінекалагічных працэдур. Тут жа басейн, парылкі і зона «штучнага сонца». Устаноўка «штучнае сонца» (шведская вынаходніцтва) дазваляе цягам аднаго сеанса (для 8-10 чалавек) атрымаць увесь спектр сонечнага святла за выключэннем ультрафіялету. Словам, не для загару гэта, а для прафілактыкі сезонных дэпрэсій, лячэння сіндрому хранічнай стомленасці.

На трэцім паверсе — урачэбныя кабінеты, фізіятэрапеўтычны і масажны блокі.

Фізіятэрапія, напэўна, рэдка дзе прадстаўлена так шырока. Ёсць і эксклюзіўнае абсталяванне. Вібратэрапія (для расслаблення мышцаў, суставаў), устаноўка для бескантактнага гідрамасажу ад пятак да шыі, біярэзанансная тэрапія з некалькімі рэжымамі ўздзеяння з дапамогай электродаў (можна і тлушч «спальваць», і з абстынентнага сіндрому вывесці).

Масажныя сталы — трансформеры. Няважна, якога вы росту і камплекцыі, зручна будзе і вам, і ўрачу. Адзін мінус — спецыялістамі пакуль не ўкамплектаваныя. Зона СПА-працэдур яшчэ даводзіцца да ладу.

«Пачынаем адначасова і другую чаргу будаўніцтва — для самабытнага адпачынку, — расказвае Валерый Мазоўка. — Легенда сведчыць, што Рагнеда спрабавала схавацца ад князя Уладзіміра на адным з тутэйшых астравоў. А калі ёсць легенда, значыць, павінен быць і замак з пад'ёмнымі мастамі, з персаналам у касцюмах тых часоў... А ў гонар усіх нацыянальнасцяў, якія некалі тут пражывалі — ліцвінаў, палякаў, рускіх, украінцаў, татараў, яўрэяў, цыганоў, зробім некалькі домікаў, у якіх можна будзе пабачыць іх побыт. На гэтай тэрыторыі будзе свая гасцініца. Ёсць надзея, што налета ўжо вы ацэніце нашы намаганні».

Матэрыялы падрыхтавала **Святлана БАРЫСЕНКА.**

# КАЛІ ЎЗЫХОДЗІЦЬ «ЗАРА», ГЭТА КРАІНЕ ТРЭБА

Вадзіцель Аляксандр Гурын выдатна ведае ўсе сцежкі-дарогі роднай гаспадаркі. Ён паказаў нам адзін з палеткаў, дзе кукуруза паднялася на рэкордную вышыню.

Спаўняецца 20 гадоў саўгасу-камбінату «Зара» Мазырскага раёна. Створаная на базе невялікага і досыць праблемнага свінагадоўчага комплексу, сёння гэта — буйная шматгаліновая гаспадарка, адзін з несумненных лідараў айчыннай сельскагаспадарчай вытворчасці, дзе ўкараняюцца сучасныя тэхналогіі, ёсць уласная перапрацоўка, развітая сетка фірменнага гандлю і не менш развітая сетка сацыяльных дабротаў. «Зара» адна дае больш за палову агульнага аб'ёму вытворчасці Мазырскага раёна. А самае галоўнае — у прыгарадзе прыгажуна-Мазыра захаваны і працягвае сталець дружны і працавіты калектыў, стасункі з якім радуюць і надаюць пачуццё аптымізму.

Карэспандэнты «Звязды» сустрэліся з **дырэктарам «Зары» Алегам СЛІНЬКО,** патомным хлебаробам, які прыняў эстафету кіраўніка ад сённяшняга губернатара вобласці Уладзіміра Дворніка. Размову пачалі з уборачнай кампаніі.

## НАМАЛОТ ЛЕПШЫ ЗА ЎСЮ ГІСТОРЫЮ

— Асноўны паказчык любой уборачнай кампаніі — валавы збор. Гэты год стаў лепшым з усіх 20 гадоў біяграфіі «Зары» — валавы збор склаў 14 тысяч 500 тон збожжа. У параўнанні з мінулым годам дабавілі адразу шэсць тысяч тон. Ураджайнасць — каля 50 цэнтнераў з гектара, летась было 32,2. Уборка прайшла дружна, арганізавана, з мінімальнымі стратамі. Дзякаваць богу, надвор'е спрыяла. Было цёпла, можна сказаць горача, але прайшлі і дажджы. У адрозненне ад мінулагодняй сітуацыі, калі нават старажылы не маглі ўспомніць больш засушлівага лета.

Адным словам, затрымак ніякіх не здаралася. Механізатары ў большасці — людзі вопытныя, прыцягвалі таксама і моладзь, няхай вучыцца пры старэйшых. Каб забяспечыць пераемнасць кадраў і вопыту.

На сённяшні дзень збожжавыя каласавыя ўбралі, падвялі вынікі, падзякавалі лепшым, уручылі каштоўныя падарункі.

***— Дазвольце пацікавіцца ўраджайнасцю на вашых новых землях, Алег Міхайлавіч. У тым жа Нараўлянскім раёне, дзе вы гаспадарыце трэці год.***

— На гэтых палях з'явілася культура земляробства, удасканалена контурнасць — працавала спецыяльная брыгада, выдаляла кустоўе. Палеткі падкармілі, усё рабілі як мае быць. І ўраджайнасць цяпер прыкладна аднолькавая па ўсёй гаспадарцы. У Нараўлі на некаторых землях бал ворабра нават вышэйшы, чым на нашых. Таму перад агранамічнай службай пастаўлена задача планаваць там вырошчванне пшаніцы.

***— Падчас леташняй сустрэчы вы сказалі: настройваем калектыў на небывала высокі ўраджай...***

— Маральная настроенасць калектыву адыграла станоўчую ролю. Але галоўнае ўсё ж у тым, што ў нас прынята штогод вытрымліваць рэгламент вырошчвання культур. Таму ўсё было зроблена своечасова — у патрэбнай колькасці ўнеслі мінеральныя ўгнаенні, сродкі абароны раслін.

Ёсць і іншыя чыста тэхналагічныя прычыны дастаткова высокага ўраджаю. Наша агранамічная служба, якую ўзначальвае Андрэй Васілевіч Турук, прымяняе перадавыя агратэхнічныя прыёмы. Каб не перагружаць увагу чытача, скажу толькі пра безадвальную апрацоўку глебы. Нашы спецыялісты лічаць, што яна ў многім вызначае поспех у вырошчванні збожжа, кукурузы. З яе дапамогай мабілізуюцца біялагічныя рэсурсы глебы, зберагаецца вільгаць. Высокі ўраджай гэтага года такую пазіцыю пацвердзіў.

Навучаныя горкім вопытам засушлівага лета, мінулай восенню пачалі займацца рамонтам сваіх меліярацыйных сістэм, іх эфектыўная дзейнасць у новых кліматычных умовах становіцца надзвычай важнай. Як і мікракропельны паліў культур. Перспектыва такая, што хутка давядзецца паліваць і кукурузу, і бульбу. Згодзен, што дорага, але харчовая бяспека краіны даражэй.

Прадукцыю ўчастка птушкагадоўлі ўпакоўваюць птушкаводы Валянціна Цесавец і Наталля Краўчанка.

## ГАЛОЎНЫ ЗДАБЫТАК — КАЛЕКТЫЎ

***— 20 гадоў назад была створана сённяшняя «Зара». Праўда, каб стаць сённяшняй, ёй спатрэбілася прайсці няпросты шлях, увабраць у сябе некалькі слабых гаспадарак. Сёння калектыў выкрышталізаваўся?***

— Яго лепшыя якасці закладваліся і фарміраваліся яшчэ Уладзімірам Андрэевічам Дворнікам, які яго стварыў і першыя гады кіраваў ім. Мы працягваем традыцыі, стараемся іх развіваць. Як высвятляецца цяпер, Уладзімір Андрэевіч у той час усё правільна разлічыў, і створаная ім сістэма гаспадарання сябе апраўдала і працуе паспяхова. У тым ліку прынцыпы работы з калектывам, з людзьмі. Новым гаспадаркам, якія былі прыняты ў нашу на правах аддзяленняў, даводзілася падстройвацца пад нашы парадкі. Улічваючы, што яны ўсе параўнальна невялікія, да ста чалавек, гэта не было асабліва складана ні для іх, ні для нас.

Спрыяльным маральным кліматам у калектыве можна растлумачыць той факт, што па выніках гэтага жніва ў нас атрымалася больш за дзесяць экіпажаў-тысячнікаў. Важна таксама і тое, што былі створаны аднолькавыя ўмовы для ўсіх механізатараў. Дзейнічалі тры атрады па ўборцы збожжавых, па чатыры камбайны ў атрадзе. Усе адпрацавалі нармальна. Добра сябе зарэкамендаваў экіпаж з Нароўлі — Віктар Голуб і Аляксандр Кудзін. Яны ўвесь час лідзіравалі, а калі былі падведзены вынікі, то сталі пераможцамі і па якасці ўборкі.

Высокія вынікі паказаў і экіпаж Аляксандра Высоцкага, яны з напарнікам Юрыем Барысенкам з года ў год дабіваюцца высокіх намалотаў. Нядрэнна спрацавалі два экіпажы з Барбарова — Аляксандра Астапенкі і Сяргея Аўраменкі, мы сёлета купілі ім два новыя гомсельмашаўскія камбайны. Першы год тэхніка паводзіла сябе не ідэальна, ішла прыцірка вузлоў і механізмаў. Астапенка — малады механізатар, набіраецца вопыту, спатрэбіцца нейкі час для станаўлення. Але ўжо сённяшнія паказчыкі абнадзейваюць.

На падвядзенні вынікаў я сказаў, што пройдзены пакуль прамежкавы этап, наперадзе работы намнога больш. Бо стаяць у полі больш за 4 тысячы гектараў кукурузы, і трэба нарыхтаваць каля 30 тысяч тон сіласу, а астатняе ўбраць на зерне. Прагноз па кукурузе неблагі. Думаю, 15—20 тысяч тон зерня павінны намалаціць. Усё гэта разам дазволіць стварыць за кошт уласных зямель моцную кармавую базу. У структуры сабекошту прадукцыі кармы займаюць каля 60—70 працэнтаў, і калі атрымаецца назапасіць збожжа на паўтара года, то гэта нядрэнная гарантыя забеспячэння жыццядзейнасці калектыву.

У бліжэйшы час трэба закладваць базу для ўраджаю наступнага года, праз два тыдні разгортваем сяўбу азімых. Рапс пачнём сеяць ужо ў гэтую суботу, а збожжавыя, як звычайна, у першыя дні верасня. Азімых трэба пасадзіць каля трох тысяч гектараў. Светлавы дзень становіцца меншым, і сур'ёзныя аб'ёмы работ давядзецца выконваць у сціслыя тэрміны. Так што задачы наперадзе не менш важныя, чым тыя, якія мы вырашалі летам.

Галоўны аграном Андрэй Турук (у цэнтры) і лепшы экіпаж аддзялення №4. На камбайне КЗС-1218 Віктар Голуб і Аляксандр Кудзін намалацілі 1495 тон збожжа.

***— Памятаю, што вы ўскладалі асаблівыя надзеі на свой рапс...***

— Не адмаўляемся ад іх і зараз, бо на нашых небагатых землях пралічваецца станоўчая эканоміка бялковых культур. Рапс сёлета ўрадзіўся слабенькім, яго ўраджайнасцю не могуць пахваліцца і іншыя гаспадаркі раёна. Аналізуем свае дзеянні і ўжо цяпер бачым, дзе недапрацавалі. Перш за ўсё кардынальна палепшым падрыхтоўку глебы. Плюс перад сяўбой варта яе ўшчыльняць і падкарэкціраваць гушчыню высеву. Тыя 4-5 кілаграмаў насення, якія рэкамендуецца ўносіць, — гэта малавата, трэба высяваць на гектар недзе ад 6 да 7 кілаграмаў. Тады дасягаецца шчыльнасць пасеваў, менш выпараецца вільгаць і будзе што ўбіраць.

***— Такім чынам, для дырэктара жніво — гэта свята душы ці кожны раз перыяд, у які ўступаеце з некаторай апаскай?***

— Калі вырашчаны добры ўраджай, то хочацца хутчэй яго ўбраць, каб не пайшлі дажджы і не страціць ні кілаграма. Бо разумееш, што чым больш намалоціш, тым хутчэй перакрыеш выдаткі, якія былі панесены. А штогод на забеспячэнне патрэб раслінаводства мы накіроўваем салідную суму — прыблізна 90 мільярдаў рублёў.

***— Што новага ў жывёлагадоўлі, Алег Міхайлавіч?***

— Павялічваем пагалоўе жывёлы, нарошчваем аб'ёмы вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі. Пабудавалі ў аддзяленнях два бычнікі на 800 галоў плюс арганізавалі лагер круглагадовага ўтрымання на 400 галоў. Плануем яшчэ адну буйную ферму ў Рудні, на глыбокай падсцілцы, для адкорму свіней.

З больш значных падзей — далучылі да сябе свінатварны комплекс на 12 тысяч галоў, які базуецца ў Нараўлянскім раёне. Праўда, разам з ім атрымалі ў «спадчыну» 90 мільярдаў крэдытных сродкаў, якія трэба вяртаць ужо зараз. Пакуль камплектуем комплекс жывёлай, першых свіней паставілі на каранцін 8 студзеня, першы прыплод атрымалі ў маі. Сёння тут каля 4 тысяч галоў. Зразумела, што нясём затраты, у тым ліку плацім штомесяц больш за мільярд рублёў у лік пагашэння крэдыту. А першая свініна пойдзе на рэалізацыю ў канцы снежня. Спадзяёмся атрымліваць тут прыкладна 120 тон свініны штомесяц. І на 4 мільярды выручкі ў месяц можам разлічваць.

***— Уся ваша свініна будзе перапрацавана на вашым жа перапрацоўчым прадпрыемстве...***

— Так, магутнасці забойнага і перапрацоўчага цэхаў гэта дазваляюць. І будзе рэалізавана нашым фірменным гандлем, які працягваем развіваць. Сёлета купілі тры новыя магазіны, адзін адрамантавалі і ён прыняў пакупнікоў. Прыступаем да рамонту другога, у верасні таксама запусцім. Трэці адчынім бліжэй да Новага года, калі пойдзе дадатковая колькасць мяса. Цяпер сетка фірменнага гандлю «Зары» налічвае 26 магазінаў і некалькі гандлёвых кропак (павільёнаў) на рынках. Нядаўна купілі будынак магазіна ў Гомелі і разлічваем на рост выручкі, бо актыўнасць пакупнікоў у абласным цэнтры больш высокая, чым у раёнах. Кажам работнікам свайго гандлю: у вас усё ёсць для паспяховай работы, гандлюйце, уносьце свой уклад у агульную скарбонку калектыву, укараняйце культуру гандлю, новыя формы абслугоўвання, зарабляйце аўтарытэт у пакупніка ў сваім рэгіёне, а мы будзем вам дапамагаць, забяспечым высакаякаснай прадукцыяй па меншай, чым у вашых канкурэнтаў, цане.

Начальніка ўчастка птушкагадоўлі Ніну Мішоту мы сфатаграфавалі ў вытворчым памяшканні, дзе ўтрымліваецца 70 тысяч галоў птушкі. А ўсяго ў птушыным гарадку — 200 тысяч нясушак.

Вось адкуль задача — атрымліваць, наколькі гэта магчыма, недарагую свініну. Таму размова ідзе пра эканомію электраэнергіі, вады і матэрыяльных рэсурсаў. Новых людзей таксама імкнёмся набіраць па мінімуме, бо рабочая сіла сёння па мерках нашага прадпрыемства (з нашымі заробкамі) дастаткова дарагая. І кожны лішні дзясятак работнікаў уплывае на сабекошт прадукцыі. Калі ў 2011—2012 гадах мы адчувалі сябе больш вольнымі ў гэтым сэнсе, то цяпер складаней. Нядаўна знайшлі магчымасць скараціць агульную колькасць прыкладна на 30 чалавек. Нікога не звальнялі, але калі людзі выходзілі на заслужаны адпачынак, іх вакансіі запаўнялі за кошт наяўных работнікаў.

Вытворчыя працэсы стараемся максімальна механізаваць, каб абыходзіцца разумным мінімумам рабочых рук. Зараз вядзём рэканструкцыю кулінарнага цэха, размешчанага ў горадзе, аднаго з трох. Многія працэсы тут будуць аўтаматызаваны. Замена ручной працы на фармовачных аперацыях дазволіць вызваліць частку людзей. Ім пасля навучання новым прафесіям прапануем работу ў цэху перапрацоўкі ці фірменным гандлі. А зніжэнне затрат на ўтрыманне персаналу адаб'ецца на цане пельменяў, галубцоў, катлет, фаршу і іншай патрэбнай насельніцтву прадукцыі.

Сёння ў нас і так затраты на парадак ніжэйшыя, чым у іншых, але бачым рэзервы і працуем над іх выкарыстаннем.

## СПАЧАТКУ БЫЛА ІДЭЯ

***— Давайце прасочым ваш вытворчы алгарытм: у сябе на комплексах вы вырасцілі жывёлу, паляводы пастараліся і накармілі яе, ёсць свая перапрацоўка — перапрацавалі. Прадалі ў фірменным гандлі і атрымалі абаротныя сродкі для вырашэння аператыўных гаспадарчых задач. Такая вось дыверсіфікацыя ў адладжаным механізме «Зары» адчувальна дапамагае вам жыць. А ці магчыма яна для іншых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў?***

— За гэтым заўсёды стаіць велізарная праца калектыву, яскравае разуменне ім сваіх задач і стратэгіі. У нас у самым пачатку стаяла ідэя, задума нашага першага кіраўніка Уладзіміра Андрэевіча Дворніка, менавіта ён выпрацаваў такую стратэгічную лінію на разнабакова развітую эканоміку гаспадаркі і шмат зрабіў для яе ажыццяўлення. Усё гэта не проста. Таму ж фірменнаму гандлю надзвычай складана сёння выжываць у канкурэнтнай барацьбе з буйнымі гандлёвымі сеткамі, скажам, з «Еўраоптам». Перапрацоўчаму прадпрыемству — у не менш жорсткім супрацьстаянні з буйнымі мясакамбінатамі. Гэта штодзённая карпатлівая праца, на якую калектыў павінен адважыцца. Тут задзейнічаны пытанні і культуры вытворчасці, і культуры гандлю, і цаны, і самае галоўнае — высокай якасці канечнага прадукту і высокай якасці абслугоўвання. На вытворчасці павінен быць нізкі сабекошт прадукцыі, пра што мы гаварылі. Каб ты мог потым лавіраваць у магазіне з цаной. Калі ў цябе цана крышачку вышэйшая, чым у суседа-канкурэнта, — усё, да цябе ніхто не ідзе.

А аб'ёмы вытворчасці ў нас такія, што права на памылку не маем. Паэт сказаў: калі запальваецца зорка, гэта некаму трэба. Перафразуем класіка і скажам, што калі ўзыходзіць «Зара» — гэта патрэбна людзям. Сёння мы забяспечваем 55 працэнтаў агульнага аб'ёму вытворчасці Мазырскага раёна і 35 — суседняга Нараўлянскага. Выручка ў месяц за сельскагаспадарчую прадукцыю складае каля 60 мільярдаў. Пяць раёнаў Гомельшчыны разам не дадуць столькі. І ніхто нам не дазволіць зніжаць планку.

***— Ці можна назваць мнагапрофільнасць адным з асноўных вынікаў 20-гадовай гісторыі калектыву?***

— Безумоўна. Такая шматпрофільнасць ратуе нас ад нейкіх кан'юнктурных нечаканасцяў на рынку, з'яўляецца пэўнай гарантыяй ад прыродных капрызаў. У тым сэнсе, што калі ў адной галіне — праблемы, выручаюць іншыя. Калі сёння з'явіліся складанасці з ялавічынай, то высокая рэнтабельнасць свініны дазваляе жыць спакойна і працаваць нармальна. Калі, дапусцім, птушка ў мінусе, то плюсуе малако. Калектыў ведае і разумее ўсе гэтыя ўзаемазалежнасці і імкнецца ўплываць на іх пазітыўна, што дазваляе заставацца на лідзіруючых пазіцыях.

***— Вы ўспомнілі пра птушку. Як справы ў птушкаводаў?***

— Нармальна. Вытворчасць нашы птушкаводы не знізілі. Па бройлеры сёння рэнтабельнасць не тая, што хацелася б, але ўсё ж маем яе каля 15 працэнтаў. Па яйках у зімовы час, калі рэалізацыя ўзрастае і крыху ўздымаецца цана, маем да 40 працэнтаў рэнтабельнасці.



Сярод мясцовых новабудоўляў — праваслаўная царква ў гонар Архістраціга Міхаіла.

дрэўцаў, без чаго высокага ўраджаю не будзе. На парадку дня — перапрацоўка сваёй садавіны, і да рашэння праблемы прыступаць збіраемся дастаткова аператыўна, каб на наступны год мець і сваё сховішча, і цэх па перапрацоўцы. Гэта высокадаходная справа, тым больш, што маем, дзе прадаць. Так ці інакш, яблыкамі, сокамі і нектарам заўсёды гандлюем. Значыць, будзем гандляваць і ўласнымі.

***— Дыверсіфікацыя — гэта цудоўна, а на што ўсё ж большыя надзеі?***

— Канешне, асноўная галіна — свінагадоўля, будзем яе нарошчваць. Узялі курс на тое, каб давесці вытворчасць свініны да 9 тысяч тон у год. Да Новага года пагалоўе свіней давядзём да 50 тысяч галоў. Свініна — спрадвеку наш беларускі прадукт, які дазваляе гаспадару ўпэўнена стаяць на зямлі. За 20 гадоў сваёй біяграфіі «Зара» гэта даказала. Калі з птушкай існуе нейкая сезоннасць ці ёсць фактары, якія на яе ўплываюць, то свініна пастаянна рэалізоўвалася цудоўна. І ў нас ужо адпрацаваны тэхналогіі кармлення, вырошчвання, каб атрымліваць высокі эканамічны эфект. Сёння атрымліваем больш за 20 працэнтаў рэнтабельнасці свініны, таму і будзем гэты накірунак развіваць надалей.

## ЛІДАР НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЭКАНОМІКІ

***— Па эфектыўнасці гаспадарання вы шмат гадоў былі лепшымі ў Беларусі. Нават маеце спецыяльны знак «Лідар нацыянальнай эканомікі». Ці ўдалося пачэсную пазіцыю захаваць?***

— Думаю, што так. Мы і сёлета зноў занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару, у першую чаргу дзякуючы эканамічным паказчыкам. На дошку Гонару за 20 гадоў заносіліся, калі не падводзіць памяць, 12 разоў.

***— Калі ласка, некалькі слоў пра сацыяльнае развіццё.***

— Любімая праца, за якую яшчэ і няблага плацяць, ужо сама па сабе важкі сацыяльны фактар. Сёння, калі расце выручка, думаем павялічваць заробак членам калектыву. Хоць ён і так неблагі — больш за 9 мільёнаў недзянамінаваных рублёў. Захавалі і сістэму натуральнай аплаты — нашы работнікі атрымліваюць дадаткова свініну, малако, яйкі, яблыкі, нават мёд.

Усе апошнія гады вялі актыўнае жыллёвае будаўніцтва, жылля дастаткова, можна сказаць. Сёння ў Махновічах некалькі незаселеных дамоў, і ў Крынічным, іншых вёсках. Вычарпаем свае рэзервы, адчуем патрэбу — зноў будзем будаваць кватэры і дамы.

Узводзім на свае сродкі для людзей царкву ў Рудні. Значную дапамогу аказваем дзіцячым садкам, школам, размешчаным на тэрыторыі саўгаса. Зараз, перад пачаткам новага навучальнага года, гэта асабліва актуальна.

У гэтым наша стратэгія — не стаяць на месцы, пастаянна нешта дабаўляць, актыўна развівацца.

**Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва саўгаса.**

УНП 400408726

Творчая брыгада шчыра дзякуе за дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі намесніку дырэктара Іне Хамутоўскай, галоўнаму аграному Андрэю Туруку і галоўнаму эканамісту Тамары Хомчанцы.

***Рэдакцыя газеты «Звязда» віншуе калектыў саўгаса-камбіната «Зара» з 20-годдзем і зычыць новых працоўных перамог, а яго членам — дабрабыту, здароўя і шчасця.***

Механізатар Мікалай Дуброва — адзін з тых, хто выдатна працаваў на прасаванні і пагрузцы саломы.

белагропромбанк

УТВЕРЖДЕНО
Протокол
Наблюдательного совета
ОАО «Белагропромбанк»
05.08.2016 № 15

## ИЗМЕНЕНИЯ

в Проспект эмиссии облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» сто восемьдесят девятого, сто девяностого выпусков, утвержденный решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк» 29.08.2014, протокол № 26

1. Подпункт 1.5 пункта 1 изложить в следующей редакции:

«**1.5. Размер уставного фонда Банка**

Уставный фонд Банка составляет 810 363 504 (Восемьсот десять миллионов триста шестьдесят три тысячи пятьсот четыре) белорусских рубля 60 (Шестьдесят) копеек.

Неденежная часть уставного фонда Банка составляет 131 065 (Сто тридцать одна тысяча шестьдесят пять) белорусских рублей 98 (Девяносто восемь) копеек, что составляет 0,02 процента от размера уставного фонда.

Уставный фонд Банка разделен на 4 051 817 523 (Четыре миллиарда пятьдесят один миллион восемьсот семнадцать тысяч пятьсот двадцать три) акции, номинальной стоимостью 20 (Двадцать) копеек каждая, в том числе: простые (обыкновенные) акции – 4 051 810 642 (Четыре миллиарда пятьдесят один миллион восемьсот десять тысяч шестьсот сорок две), привилегированные акции – 6881 (Шесть тысяч восемьсот восемьдесят одна).».

2. Подпункт 2.5 пункта 2 изложить в следующей редакции:

«**2.5. Форма и вид облигаций, объем выпуска, количество, номинальная стоимость облигаций:**

| | | |
|---|---|---|
| Номер выпуска | 189 | 190 |
| Валюта выпуска | Белорусский рубль | |
| Форма и вид облигаций | Бездокументарные, именные, процентные, неконвертируемые | |
| Объем выпуска, бел. рублей | 500 000 000 000,0 | 500 000 000 000,0 |
| Объем выпуска с учетом проведения деноминации официальной денежной единицы Республики Беларусь с 01.07.2016, бел. рублей | - | 50 000 000,00 |
| Количество облигаций (шт.) | 500 000 | 500 000 |
| Серия, номера облигаций | ОБ189 0000001 - 0500000 | ОБ190 0000001 - 0500000 |
| Номинальная стоимость облигации, бел. рублей | 1 000 000,0 | 1 000 000,0 |
| Номинальная стоимость облигации с учетом проведения деноминации официальной денежной единицы Республики Беларусь с 01.07.2016, бел. рублей | - | 100,00 |

».

Заместитель Председателя Правления
ОАО «Белагропромбанк» С.П.Чугай

И.о.главного бухгалтера
ОАО «Белагропромбанк» Н.П.Фурманова

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

---

## ИЗМЕНЕНИЯ и ДОПОЛНЕНИЯ

в проектную декларацию по строительству объекта «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой в границах улиц Кольцова, Восточной, переулка 4-го Полиграфического в г. Минске. Жилой дом №1 по генплану».

**Сведения о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «Фрелизэйсэксим» (ООО «Фрелизэйсэксим»), УНП 101517886. Местонахождение: г. Минск, ул. Лобанка, д. 79, офис 22 (р-н Сухарево), юр. адрес: Минский р-н, д. Валерьяново, ул. Нижняя Луговая, д. 4а, к.1п, тел. (8 017) 391 21 00.

Цель проекта — строительство 25-этажного, односекционного, 192-квартирного каркасно-блочного жилого дома № 1 по генплану в составе Объекта: «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроено-пристроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой в границах ул. Кольцова, Восточной, пер. 4-го Полиграфического».

Сведения о сроках реализации — завершение строительства — сентябрь 2016.

Местонахождение строящегося объекта: г. Минск, в границах ул. Кольцова, Восточной, пер. 4-го Полиграфического.

Цена одного квадратного метра общей площади жилых помещений составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1250 долларам США. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа.

Количество предлагаемых объектов для заключения договоров создания объектов долевого строительства — 45 единиц:

1-комнатные квартиры — 15 единиц;

2-комнатные квартиры — 15 единиц;

3-комнатные квартиры — 15 единиц.

Условия оплаты: оплата цены объекта долевого строительства производится дольщиком единовременно либо поэтапно в установленный договором период по графику платежей. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости квартиры.

Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию — декабрь 2016г.

Условия ознакомления с информацией по проекту:

ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно на сайте www.delfin.by

Телефоны: (8-017) 391-21-00, (8-029) 6 779 769.

---

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «АЛЕВКУРП», г. Минск, ул. П.Бровки, д.6, ком.332** |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Инвентарный номер | Общая площадь | Назначение |
|---|---|---|---|
| Хранилище БТИ | 610/С-35343 | 2 488 кв.м | Здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ |

Месторасположение: Минская обл., Борисовский р-н, **г. Борисов**, ул. Чаловской, д. 19

**Сведения о земельном участке**: земельный участок пл. 0,9995 га предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 16.10.2032) для обслуживания здания хранилища БТИ.

Ограничения прав: участок площадью 0,0016 га — охранная зона линий электропередачи, участок площадью 0,0247 га — охранная зона сетей и сооружений водоснабжения.

**Начальная цена с НДС 20 % — 377 387 руб. 71 коп. (снижена на 20%)** (3 773 877 100 бел. руб.)

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г.Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **15** календарных дней после проведения аукциона. |

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано **в газете «Звязда» от 09.06.2016**

**Аукцион состоится 08.09.2016 в 14ч. 00 мин.** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703.

Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 06.09.2016 до 17.00** по указанному адресу.

Тел: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71.
**www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by

---

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ЧПУП «Владимир и Данила», Витебская обл., г.п. Россоны, ул. Восточная, 34А/4** |

**Предмет аукциона** (продается одними лотом)
**Месторасположение —** Витебская обл., Россонский р-н, г.п. Россоны, ул. Восточная

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|---|
| **Нежилое здание** | здание многофункциональное | 101,5 кв.м | 253/С-501042 | 34А/3 |
| Составные части и принадлежности: мансарда, пристройка | | | | |
| **Навес** | сооружение специализированное складов, хранилищ | 113 кв.м | 253/С-501041 | 34А/1 |
| **Навес** | | 82 кв.м | 253/С-501044 | 34А/6 |
| **Здание проходной** | здание административно-хозяйственное | 18,2 кв.м | 253/С-501040 | 34А |
| **Здание холодильников** | здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 453,5 кв.м | 253/С-501043 | 34А/5 |
| Составные части и принадлежности: два навеса | | | | |
| **Цех сортировки** | здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 463,5 кв.м | 253/С-502021 | 34А/2 |
| Составные части и принадлежности: пристройка, два навеса, рампа | | | | |
| **Незавершенное капитальное строение** | административно-бытовой корпус (готовность строения 70%) | 398,37 кв.м | - | - |

**Оборудование и иное имущество:**

| Наименование | Инв.№ по бух.учету |
|---|---|
| Компрессорно-конденсаторный агрегат, ХАП 70-2х6FC | 015 |
| Агрегат компрессорный с воздухоохладителем, конденсатором | 021 |
| **Оборудование для холодильника** (холодильный агрегат TFHS 4540F, конденсатор CJR-612524, воздухоохладитель DFC - 634510-E) | 004 |
| Радиометр-дозиметр | 030 |
| **Ящики пластиковые** 1500 шт. | - |

**Начальная цена без НДС – 400 000 руб. 00 коп.**
(4 000 000 000 бел. руб.)

**Сведения о земельном участке:** га предоставлен продавцу пл. **0.7751га** на праве постоянного пользования для строительства производственной базы.

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № 3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после получения свидетельства о государственной регистрации на незавершенное капитальное строение (АБК) и согласования проекта договора купли-продажи с залогодержателем, в связи с наличием обременения в пользу ОАО «Белагропромбанк» (ипотека).

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения аукциона | **27.09.2016** в 11ч. 00 мин. по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| Дата и время окончания приема документов | **26.09.2016** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны:** | Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by |

---

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1.<br>Здание склада (капитальное строение инв. №230/С-15130), начальная стоимость лота 2040 белорусских рублей.<br>Лот №2.<br>Здание проходной (капитальное строение инв. №230/С-15136), начальная стоимость лота 8090 белорусских рублей. |
| Собственник (владелец) имущества | Открытое Акционерное Общество «Лепельпромшвеймебель» |
| Местонахождение имущества | Витебская область, г. Лепель, ул. Володарского, 1, 1/4.<br>По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору ОАО «Лепельпромшвеймебель» Жукову Владимиру Анатольевичу, тел. 8 (033) 337-15-38 |
| Наличие обременений | Не имеется |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4<br>22 сентября 2016 года в 11.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4<br>Судебный исполнитель — Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24<br>Начальник отдела — Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 - Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 15.00 часов 21 сентября 2016 года.<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

---

## Уважаемые акционеры!

ОАО «МАПИД» сообщает, что выплата дивидендов будет осуществляться в период с **1 сентября 2016 года** по **30 сентября 2016 года**.

**Общим собранием акционеров ОАО «МАПИД» установлен следующий порядок выплаты дивидендов:**

**- работникам Общества, юридическим лицам — путем перечисления на расчетные счета;**

**- физическим лицам, не работникам Общества — путем перечисления через депозитарий «Лидеринвест» с последующей выплатой; по заявлению акционера — почтовым переводом;**

**- физическим лицам, не работникам Общества, имеющим право на стандартные вычеты по подоходному налогу, — по заявлению акционера путем перечисления на электронные карточки.**

Депозитарий ЗАО "Лидеринвест" располагается по адресу: г. Минск, ул. Я.Мавра, д. 41, оф. 512.

**При себе иметь документ, удостоверяющий личность.**

**Администрация.**

УНП 100008115.

---

БАНК РЕШЕНИЕ

Уважаемые вкладчики **ЗАО «Банк «Решение»**!

Информируем Вас о том, что с **26 сентября 2016** в отношении приведенных ниже вкладов будут действовать новые условия:

| Вид вклада (депозита) | Ранее действующий размер процентных ставок | Новый размер процентных ставок |
|---|---|---|
| «Шкварка» сроком на 12 месяцев в белорусских рублях* | 30% | **20 %** |
| «Шкварка» сроком на 1 год (безотзывный) в белорусских рублях** | 30%, 27% | **20 %** |
| «Шкварка» сроком на 7 месяцев (безотзывный) в белорусских рублях** | 29%, 27% | **20%** |
| «Новый» в иностранной валюте | 4,5% | **4%** |
| «Шкварка» в иностранной валюте*** | 5,5%, 4,5% | **4%** |
| «Шкварка на 2 годы» в иностранной валюте**** | 5% | **4%** |
| «Шкварка» сроком на 2 года в иностранной валюте***** | 5% | **4%** |

* Новый размер процентной ставки применяется по вкладам, оформленным в период с 01.09.2015 по 11.11.2015.
** Новый размер процентной ставки применяется по вкладам, оформленным в период с 01.04.2016 по 12.06.2016.
*** Новый размер процентной ставки применяется по вкладам, оформленным в период с 15.04.2015 по 19.07.2015.
**** Новый размер процентной ставки применяется по вкладам, оформленным в период с 17.11.2015 по 28.12.2015.
***** Новый размер процентной ставки применяется по вкладам, оформленным в период с 01.04.2016 по 18.04.2016.

По возникшим вопросам Вы можете обратиться в контакт-центр Банка (465 – с мобильного, 8 801 100 33 33 – бесплатный номер для звонков с городского телефона).

ЗАО «Банк «Решение» УНП 100789114 Лиц. №14 от 08.06.2016 г. НБ РБ

---

Организатор торгов, ликвидатор ООО «Белсервисснаб» - Михайлова С.А. действующая на основании Протокола внеочередного собрания участников ООО «Белсервисснаб» № 71 от 05.02.2016 г., сообщает о дополнении к объявлению о реализации имущества ООО «Белсервисснаб», опубликованному в номере от 11 августа 2016 г. На продажу выставлены дополнительные предметы торгов:

| № лота | Наименование лота | Кол-во, ед. | Начальная цена за 1 ед. лота в белорусских рублях | Шаг торгов 5% | Задаток 10% |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль RENAUT MASTER, кузов №VF1FDC2L638703197,2007 г.в. | 1 | 16324,21 | 816,21 | 1632,42 |
| 2 | Автомобиль RENAUT MASTER, кузов №VF1FDC1M63736505,2007 г.в. | 1 | 16324,21 | 816,21 | 1632,42 |
| 3 | Автомобиль MERSEDES-BENZ 816D, кузов №WDB6703241N12893,2007 г.в. | 1 | 37236,73 | 1861,83 | 3723,67 |
| 4 | Автомобиль LAND ROVER DEFENDER, кузов, №SALLDWRP8DA431983 2013 г.в. | 1 | 101915,67 | 5095,78 | 10191,56 |

Для участие в торгах Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичной форме по следующим платежным реквизитам: ООО «Белсервисснаб» р/с 3012000293011 в ЦБУ 5 г. Минска ЗАО «Цептер банк» код 820, УНП 690259099.
Задаток должен поступить на указанный счет Продавца не позднее 9 сентября 2016 года.
Торги состоятся 16 сентября 2016 в 12.00 по адресу: г. Минск, пер. Горный,3, комн.11.
С дополнительной информацией об условиях и порядке проведения торгов можно ознакомиться на сайте газеты «Звязда» (№ 153 от 11.08.2016 г.) или по адресу: г. Минск, пер. Горный,3, комн.11. Тел: (017) 290-09-40, 286-30-13.»

---

## НОВОПОЛЬСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ПУХОВИЧСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

проводит открытый аукцион по продаже земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома, с расположенным на нем незавершенным строительством, не законсервированным жилым домом, гражданам Республики Беларусь.

| № лота | Наименование лота | Площадь земельного участка (га)/ процент готовности жилого дома | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 624484003101000029 и расположенный на нем незавершенный строительством не законсервированный жилой дом, расположенные по адресу: д. Дудичи, ул. Птичанска, д. №16А | 0,2471 /12 | Возможность электрификации, газификации, водоснабжения | 144,00 | 14773,43 | 2955,00 |

Задаток перечисляется на р/с № 3600625110003 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 27, БИК 153001795, УНН 600177772, ОКПО 04429639, код платежа 04901, Новопольский сельисполком.
Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении.
Аукцион состоится 27 сентября 2016 года в 15.00 часов по адресу: аг. Новополье, ул. Центральная, 21 (здание исполкома) Пуховичского района Минской области.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21 сентября 2016 года до 17.00 по вышеуказанному адресу.

Телефоны для справок: (8-017-13) 3-03-16, 3-03-35; сайт Пуховичского райисполкома:**www.pukhovichi/minsk-region.by**

---

## ДЕЩЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УЗДЕНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

27 **сентября 2016 года** по адресу аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет председателя (2-й этаж, кабинет № 3) в 10-00 часов проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. (без учета деноминации/с учетом деноминации) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения), руб. (без учета деноминации/с учетом деноминации) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Дещенский сельисполком | д. Володьки, ул. Окружная, уч.28 | 0,1499 | 625680202201000289 | 90000000/ 9000,00 | 11023800/1102,38 |
| Лот №2 | Дещенский сельисполком | д. Володьки, ул. Окружная, уч.30 | 0,1500 | 625680202201000290 | 90000000/ 9000,00 | 10470700/1047,07 |
| Лот №3 | Дещенский сельисполком | д. Городище, ул. Центральная, уч. 2Б | 0,1331 | 625680203401000036 | 90000000/ 9000,00 | 11957200/1195,72 |
| Лот №4 | Дещенский сельисполком | д. Теплень, ул. Новая, уч. 18Б | 0,1482 | 625680213201000198 | 90000000/ 9000,00 | 11957200/1195,72 |
| Лот №5 | Дещенский сельисполком | д. Яченка, ул. Центральная, уч. 71 | 0,1500 | 625680215801000167 | 75000000/ 7500,00 | 11957200/1195,72 |

УНП 600537220

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Имеется возможность подключения к электроснабжению, водоснабжению, газоснабжению.
Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № 3641062500114 Дещенского сельского исполнительного комитета в ЦБУ № 625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 601068832, код платежа - 04901.
Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.
Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг.Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет управляющего делами (2-этаж), с 8-00 до 17-00 по рабочим дням по **19 сентября 2016 года** включительно.
Участники аукциона должны представить следующие документы:
заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;
копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.
При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.
Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.
Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.
Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.
Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.
Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.
Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.minsk-region.by, либо по телефонам (801718) 35111, 35135, 35151.

---

Минский городской центр недвижимости

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

сообщает о предстоящем проведении аукциона с условиями на право проектирования и строительства объекта «Многофункциональный комплекс на пересечении ул.Маяковского - ул.Аранская».

**Телефон для справок (017) 226-16-72.**

УНП 190398583

---

Утерянный полис страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время пребывания за границей формы: 2РП,2РН серии БА0961580 считать недействительным.

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения сроком на 3 (три) года договора аренды части здания вокзала, принадлежащего УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» на праве хозяйственного ведения

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | Часть здания вокзала с инв.№ 133/С-4959. Площадь, сдаваемая в аренду, – 5,0 кв.м<br>Размер ежемесячной арендной платы – 204,00 (2 040 000)* бел. руб.<br>Целевое назначение - размещение вендинговых аппаратов. | Брестская обл, Лунинецкий р-н, г. Лунинец, ул. Вокзальная, 6/1 | **Начальная цена продажи права с НДС, бел. руб.** | **Задаток, бел. руб.** | **Шаг аукциона, %** |
| | | | 204,00 (2 040 000)* | 20,40 (204 000)* | 5 |

()* - цена указана в денежных знаках образца 2000г.

Аукцион состоится **26.09.2016 в 11.00**, прием заявлений в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу Организатора аукциона. Окончание приема заявлений **22.09.2016 в 10.00**.
Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель - РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже права заключения договора аренды части здания вокзала, принадлежащего УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги», проводимом **26 сентября 2016 г.**
Полный текст извещения о проведении аукциона, в том числе порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона, условия оплаты, размер штрафа, содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Все желающие могут ознакомиться со сдаваемым в аренду имуществом. Контактное лицо: Веренич Татьяна Анатольевна 8 (01647) 4-12-37.

**Организатор аукциона • адрес: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 3 этаж • +375 17 306-00-57 • +375 29 550-09-52 • + 375 29 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ОАО «ТРЕСТ № 26 ЖЕЛЕЗОБЕТОНМОНТАЖ», г. Минск, ул. Харьковская, дом 15, 3 этаж |
| **Продавец** | Филиал СУ-86 ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж», г. Могилев, проспект Пушкинский,63. Тел: +375 222 48 11 13 |

**Предмет аукциона**

**Транспорт, расположенный по адресу:** г. Могилев, ул. Челюскинцев, 78а, в составе:

| № п/п лота | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел.руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел.руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Легковой автомобиль Фольксваген Пассат 2008 г.в. цвет серебристый металлик, 1800 см. куб. объем., бензин | 97 632 000 (9 763 руб. 20 коп.) | 4 881 600 (488 руб. 16 коп.) |
| 2 | Автобус РАДИМИЧ А0921 2010 г.в., цвет белый, 5192 см. куб. объем, дизель | 196 668 000 (19 666 руб. 80 коп.) | 9 833 400 (983 руб. 34 коп.) |

**Порядок ознакомления:** Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9-00 до 16-00, перерыв с 12-00 до 13-00. Ответственное лицо: Жаглевский Дмитрий Давыдович, контактные телефоны: 48 11 13, 8(029)6016244, 8(033)6543531

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/счет 3012102754010 в Региональной Дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» код 369 УНП 100120830, получатель платежа ОАО «ТРЕСТ № 26ЖЕЛЕЗОБЕТОНМОНТАЖ».

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** Не более **15** (пятнадцати) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. № 16 "О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица". Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Могилев, пр-т Пушкинский, 63, начиная со дня публикации извещения.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **05.09.2016** в 15.00 по адресу**: филиал СУ – 86 ОАО «ТРЕСТ № 26 ЖЕЛЕЗОБЕТОНМОНТАЖ», г. Могилев, пр-т Пушкинский, 63** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **02.09.2016** до 16.00 по адресу: **г. Могилев, пр-т Пушкинский, 63** филиал СУ-86 ОАО «ТРЕСТ № 26 ЖЕЛЕЗОБЕТОНМОНТАЖ» Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются |

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ГРОДНОТЕАМОНТАЖ»

| | | | |
|---|---|---|---|
| Предмет торгов, краткая характеристика, местонахождение | **Лот №1**<br>**Капитальное строение инв. № 400/С-20092** (административное здание с мастерскими) кирпичное, S общ. 705,7 м², 1954 г.п. Воздушная электрическая сеть двухпроводная (провод ПВ-1 1*4 протяженностью 25 м.п.).<br>**Капитальное строение инв. № 400/С-20094** (мастерские) кирпичное, S общ. 615,5 м², 1954 г.п. Кабельная линия электропередачи 0,4 кВ (кабель АПВБ-1 3*70+1*35 протяженностью 100 м.п.). Кабельная линия электропередачи 0,4 кВ (кабель ВВБ-1 3*120+1*50 протяженностью 150 м.п.). **Капитальное строение инв. №400/С-20319** (склад с двумя навесами) блочное, S общ. 332,6 м², 1954 г.п. Воздушная электрическая сеть четырехпроводная (провод ПВ-1 1*35, протяженностью 35 м.п.). **Капитальное строение инв. № 400/С-20096** (склад) блочное, S общ. 76,1 м², 1954 г.п. Воздушная электрическая сеть четырехпроводная (провод ПВ-1 1*4, протяженностью 10 м.п.). **Капитальное строение инв. №400/С-20093 (**проходная) кирпичное, S общ. 23,2 м², 1954 г.п. Воздушная электрическая сеть двухпроводная (провод ПВ-1 1*4, протяженностью 50 м.п.). Бетонное ограждение площадью 241 м² с 2-мя воротами автомобильными металлическими. Бетонное ограждение площадью 27 м². Асфальтобетонное покрытие площадью 1769 м² с бордюром протяженностью 21 м.п. и газоном обыкновенным площадью 138 м². Водопроводная сеть дворовая d 50 мм протяженностью 44,5 м (чугун). Водопроводная сеть дворовая d 32 мм, протяженностью 26,5 м (сталь). Канализационная сеть d 150 мм фекальная, протяженностью 124,5 м (керамика) | | |
| Местонахождение имущества: **Гродненская область, г. Гродно, ул. Титова, д.14** | | | |
| Информация о земельном участке | Имущество расположено на земельном участке площадью 0,4132 га с кадастровым номером 440100000001003056, назначение – для обслуживания зданий и сооружений по ул.Титова, д.14*<br>* - градостроительным проектом предусматривается изменение целевого назначения производственной застройки под общественную (объекты культурно-просветительского назначения) | | |
| Условия аукциона | - разработка в течение одного года со дня заключения договора купли-продажи проектно-сметной документации на реконструкцию зданий под объекты общественного назначения;<br>- введение зданий в эксплуатацию в срок, установленный проектно-сметной документацией, но не позднее трех лет со дня заключения договора купли-продажи*<br>* В договоре купли-продажи будут предусмотрены меры ответственности покупателя за невыполнение условий продажи объекта. | | |
| Наличие обременений | Капитальное строение инв. № 400/С-20094 (ипотека, правообладатель: ОАО Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк») | | |
| Начальная цена | **738 477,12 рубля с учетом НДС** | Сумма задатка (5%) | **36 924 рубля** |
| Сведения о продавце | ОАО «Гроднотеамонтаж», г. Гродно, ул. Дзержинского, 86, тел. 8(0152) 72 06 16 | | |
| Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906 | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов | Условия оплаты | определяются по согласованию сторон |
| **Торги состоятся 26 сентября 2016 года в 12.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| Срок подачи документов для участия в торгах | **по 20 сентября 2016 года включительно до 16.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | |
| Условия участия и порядок проведения аукциона на сайте www.fincentr.by, телефоны для справок: 8(0152) 77 23 79, 74 49 11 | | | |

■ З кінапляцоўкі

# ТРЫ ЭПІЗОДЫ З ЖЫЦЦЯ БАРОНА

## На некалькі дзён здымак фільма «Экспрапрыятар» Бабруйск ператварыўся ў Галіч

**Апошнім часам расійскія кінематаграфісты вельмі любяць здымаць фільмы ў Беларусі. І горад на Беразіне карыстаецца попытам нараўне з Мінскам, Брэстам і Гродна. Менавіта тут нядаўна здымалі сцэны да вядомага ўсім тэлесерыяла «Бандыцкі Пецярбург» — «Экспрапрыятар» . Гэта 16-серыйная карціна па раманах Андрэя Канстанцінава з цыкла «Юнацтва Барона». У цэнтры падзей — дзяцінства злодзея, вядомага ўсяму Ленінграду і блатному свету Юрыя Аляксеева па мянушцы Гарбун, ці, як яго яшчэ называлі, Барон, бо ён быў апошнім нашчадкам дваранскага роду. Карэспандэнт «Звязды» паназірала за тым, як ствараецца сённяшняе кіно.**

### Горад, дзе спыніўся час

«Паляванне на гаўляйтара», «Сляды апосталаў», «Цугцванг», «Смерш» — вуліцы і будынкі Бабруйска станавіліся натурай для здымак за апошнія некалькі гадоў не раз. Цяпер сюды завітаў сам рэжысёр Уладзімір Краснапольскі — легенда савецкага кіно, вядомы па культавых фільмах «Цені знікаюць апоўначы» і «Вечны кліч», з сучасных — «Вольф Месінг», «Дом з лілеямі». У свае 83 гады славуты рэжысёр выглядае на зайздрасць бадзёра, і ўвесь у працы. Для здымак «Экспрапрыятара» ў Бабруйску выбралі тры пляцоўкі, адна з якіх — база агародніны ў будынку старадаўняй крэпасці. Па сцэнарыі гэта папраўчая калонія, адкуль выходзіць на волю галоўны герой. Наогул бабруйская крэпасць у расійскіх кіношнікаў месца вельмі папулярнае, але не адзінае з тых, што часта трапляюць у кадр. Вельмі добры тут прыватны сектар, амаль не крануты цывілізацыяй. Дамкі з каніцамі, не прычасаныя на сучасны лад сады, буйная расліннасць і спакой. Жыццё тут рухаецца па сваіх законах. Якраз тое, што трэба для «Экспрапрыятара», падзеі якога адбываюцца ў 50—60-я гады мінулага стагоддзя.

— Бабруйск выбралі таму, што тут вельмі спагадлівыя людзі, улады заўсёды ідуць насустрач, суб'екты гаспадарання рады нас бачыць, і такіх аб'ектаў, як тут, няма ва ўсёй Беларусі, — кажа **Ірына ГРОМАВА, намеснік дырэктара па аб'ектах кінакампаніі «КіВі-прадакшн»**, якая дапамагае расійскаму «Фаварыт-фільму» падбіраць для здымак найбольш падыходзячыя месцы.

— Сюды прыязджаеш і трапляеш у іншы свет,— **Аляксандр ХАЛАДЦОЎ, мастак-пастаноўшчык фільма**, таксама лічыць горад ідэальным для здымак. — Бабруйск для кіно вельмі сімпатычны. І жыхары вельмі адказна ставяцца да здымачнага працэсу.

Ён узгадвае кур'езны выпадак, калі тут здымалі «Паляванне на гаўляйтара». У адным прыватным будынку гарэлі сучасныя ліхтары, якія не ўпісваліся ў канву карціны. Гаспадароў папрасілі іх выключыць, і былі вельмі ўражаны, калі на студыю патэлефанавалі праз некалькі дзён, каб спытацца, ці можна іх уключаць зноў.

### Шанц трапіць у акцёры

Два дні здымак у Бабруйску — сапраўднае свята для тутэйшых аматараў кіно. Падбор людзей для масоўкі ішоў з сярэдзіны чэрвеня. Усе ахвотныя прыняць удзел мелі магчымасць пакінуць свае каардынаты ў спецыяльна створанай «УКантакце» групе. Яна будзе дзейнічаць і пасля здымак. Там можна знайсці свежую інфармацыю па здымках у Мінску, Бабруйску. Брыгадзір па масоўцы Андрэй Галіенка абяцае, што ніводная кандыдатура не застанецца без увагі.

На адно месца ў масоўцы на «Экспрапрыятара» прэтэндавала больш за 200 чалавек, але пасля адбору засталося каля 80. Запрашалі перш за ўсё тых, хто па сваёй знешнасці адпавядае 1960-м. Тыя, у каго былі фарбаваныя валасы і ўльтрамодныя стрыжкі, адсяваліся адразу.

Бабруйчане Алег Крупеннік, Аксана Міронава, Сяргей Бокій і іншыя сталі ўжо пастаяннымі «акцёрамі», ездзяць здымацца ў масоўках нават у Мінск. Акрамя 18 тысяч рублёў за здымачны дзень, атрымліваюць яшчэ шмат станоўчых эмоцый.

Удзел у кіно — гэта яшчэ добрая магчымасць папрацаваць разам з мэтрамі на адной пляцоўцы. Такімі, як вядомы артыст Раміс Ібрагімаў, які зняўся амаль у 50 стужках. Роля ў «Экспрапрыятары» ў яго маленькая, але значная. Ён не злодзей у законе, але меў калісьці адносіны да крымінальнага свету. Таму для людзей, якія трапілі ў цяжкае становішча, парада вопытнага Халіда вельмі значная. Для артыста вельмі ганарова зняцца ў стужцы Уладзіміра Краснапольскага.

— Краснапольскі адзін з найбольш выдатных рэжысёраў, з якім цікава працаваць, бо ён не проста здымае стужкі, ён імі жыве, — гаворыць акцёр. — Ён рэпеціруе, што цяпер рэдкасць у кіно. Тым больш у серыялах. Маладыя акцёры звычайна працуюць з чыстага аркуша. Гэта, на жаль, біч сучаснага кіно. Тое кіно, якое здымалася Краснапольскім і іншымі рэжысёрамі, адыходзіць. Сёння ніхто нават не спрабуе так працаваць.

### Была база, стала турма

Вольга Шчэрба, загадчыца базы, якая забяспечвае ўвесь Бабруйск памідорамі, агуркамі,



У фільме ў Раміса Ібрагімава роля маленькая, але вельмі важная.

яблыкамі, бульбай, морквай, з задавальненнем прымае здымачныя групы. Кажа, што гэта адбываецца за апошні час ўжо трэці раз. Сама з вялікай цікаўнасцю назірае за здымкамі.

Вольга ахвотна пазіруе на фоне змрочных сцен, шчоўкаюць затворы фотакамер. «А шарыкаў не бачыце?» — усміхаецца яна, намякаючы, што ў вежы жывуць прывіды. Збоку нехта нервова войкнуў: «А ў мяне на здымку вас дзве атрымаліся».

Вольга Міхайлаўна прывідаў не баіцца. За 8 гадоў работы тут яна ўжо стала для іх сваёй. А спачатку, кажа, і сеткі па начах падалі, і іншыя нечаканасці здараліся.

Для захавання гародніны і садавіны крэпасць — выключны аб'ект. Сцены тут 4-метровыя — зімой нічога не мерзне, а летам не гніе. Вось толькі без дазволу нельга нават і цвіка забіць — аб'ект пад аховай дзяржавы.

### Тэмы для кіно здрабнелі

Уладзімір Краснапольскі для ўсіх з прысутных на здымачнай пляцоўцы аўтарытэт. Любое яго слова — закон. Пакуль рэжысёр не вызваліцца, лезці да яго з пытаннямі бессэнсоўна. Спачатку справа, а потым — любы капрыз.

— Мне гэты твор спадабаўся перш за ўсё асобай, — кажа пра будучую карціну Уладзімір Краснапольскі. — Гэта быў рэальны герой, які памёр дзесьці ў 1995 годзе. Мы ўспамінаем яго дзяцінства, юнацтва. Гісторыя хлопчыка, які перажыў арышт бацькі, блакаду. Ён стаў злодзеем, але не проста кішэннікам або кватэрным рабаўніком: ён рабаваў тых, хто нажыўся на Ленінградскай блакадзе. У фільме ёсць эпізод, калі за дарагую залатую рэч даюць усяго 8 запалак. Для чалавека, які вырас у раскошы і добра разбіраўся ў мастацтве, гэта было шокам. Ён ненавідзеў такіх людзей, называў сябе «экспрапрыятарам», бо спецыялізаваўся на крадзяжах антыкварных каштоўнасцяў. Але за ўсё сваё жыццё ён нікога не забіў. Андрэй Канстанцінаў пісаў, што гэта была асоба, якую паважалі нават чэкісты. Мы ставім акцэнт на тым, што ён усё жыццё трапляў у вельмі цяжкія абставіны, але паўсюль знаходзіліся тыя, хто яму дапамагаў. Нават у турме. Там сядзелі людзі, якія чыталі Герцэна і Дастаеўскага. Былі каралямі сярод зладзеяў, але справядлівымі. Цікава паглядзець збоку, як такі чалавек выжывае.

Краснапольскі — рэжысёр якаснай школы, яму заўсёды быў цікавы лёс чалавека, фільмы, дзе падзеі не толькі звязаны нітачкай сюжэта, а яшчэ і абапіраюцца на эпоху.

— Калі здымаў карціну пра Месінга, скептыкі казалі: што там незвычайнага, фокусы і ўсё. Мне ж было цікава паказаць жыццё чалавека, які змагаўся з тым, што бачыў будучыню, але нічога змяніць не мог. Як ён гэта перажываў. Мяне папракалі, што я ўсё выдумаў. А я чытаў рэдкія матэрыялы.

Сучаснае кіно выклікае ў мэтра іронію. Ён лічыць, што тэмы здрабнелі.

— Раней былі сацыяльныя фільмы, з яскрава паказаным класавым канфліктам, а цяпер праблемы зводзяцца да банальных рэчаў — дзе купіць танней, а прадаць даражэй, — разважае ён. — Кола тэм замкнулася, людзі перасталі ўсміхацца адзін аднаму. Класік памыляўся. Свет адна прыгажосць не выратуе, без дабрыні нічога не атрымаецца. Акцёру цяпер цяжка раскрыцца ў вобразе.

— Наколькі сёння цяжэй здымаць кіно? Шмат хто скардзіцца, што прыходзіцца эканоміць нават на дробязях... — пацікавіўся карэспандэнт «Звязды» ў рэжысёра.

— Сёння бясконца складана здымаць. Раней давалася сума, якой хапала і на карціну, і на паездкі. А цяпер яна вельмі ўрэзаная — як хочаш, так і здымай. Прыходзіцца выбіраць больш танную тэхніку, камеры, падбіраць акцёраў. Кульгае не толькі якасць — канстытуцыя фільма іншая. Больш размоў, камерных сцэн пра тое, што зроблена або што адбудзецца. А кіно — гэта пластыка: чым больш карцінкі, дзеяння, тым лепш.

Сёння вельмі цяжка стварыць эпоху 1960-х, на вуліцах адны замежныя машыны. Знайсці такі спакойны горад, як Бабруйск, — з ракой, турэмнымі варотамі таго часу — цяжка. Тут мы здымаем Галіч — маленькі населены пункт, дзе спакойна цячэ жыццё. Тут і машын меней, і вальней. І, паклаўшы руку на сэрца, скажу: прыязджаеш у горад, далёкі ад сталіцы, а там і людзі лепшыя, і ставяцца да цябе па-добраму. А ў Маскве толькі на пераездах траціцца шмат часу. Я ўжо не кажу пра выдаткі. У Беларусі мы ўжо чатыры карціны знялі. Кожны раз заставаліся задаволенымі і карціна атрымлівалася без нерваў.

А здымкі «Экспрапрыятара» Бабруйскам не заканчваюцца, стужка будзе стварацца аж да снежня. Ад двухдзённай працы ў горадзе на Бярэзіне застанецца хвілін 8-9. Гэтага, лічыць рэжысёр, дастаткова, каб зразумець характар героя.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

Апошняя падрыхтоўка да здымак.

## Даты. Падзеі. Людзі

### 24 ЖНІЎНЯ

**79** год — адбылося першае вядомае і самае жудаснае вывяржэнне вулкана Везувій. У той дзень раніцай над вулканам паднялося чорнае воблака, попел з жарала вулкана засланіў сонца. На вуліцу нельга было выйсці, не прыкрыўшы галаву падушкай, бо разам з попелам з неба сыпаліся і цяжкія камяні. Вывяржэнне Везувія прывяло да гібелі трох гарадоў — Пампеі, Геркуланума, Стабій і некалькіх невялікіх паселішчаў і віл. У працэсе раскопак высветлілася, што ў гарадах усё захавалася такім, якім было да вывяржэння. Пад шматметровай таўшчынёй попелу былі знойдзены вуліцы, дамы з гаспадарчым начыннем, людзі і жывёлы, якія не паспелі выратавацца. Сіла вывяржэння была такая, што попел ад яго далятаў нават да Егіпта і Сірыі.

**960** год — нарадзілася Рагнеда Рагвалодаўна, полацкая князёўна, асветніца. Дачка полацкага князя Рагвалода, жонка вялікага князя Уладзіміра Святаслявіча, маці князя Ізяслава Уладзіміравіча. Паводле падання, пасля хрышчэння князя Уладзіміра і ліквідацыі яго гарэма Рагнеда адмовілася другі раз выйсці замуж і пастрыглася ў манашкі пад імем Анастасія. Памерла ў 1000 г. У Заслаўі Рагнедзе і яе сыну Ізяславу ўстаноўлены помнік.

**1936** год — вынесены прысуд па справе так званага «Трацкісцка-зіноўеўскага аб'яднанага цэнтра», сфабрыкаванай у сярэдзіне 30-х гадоў па абвінавачванні шэрагу асоб у правядзенні антысавецкай, шпіёнскай і тэрарыстычнай дзейнасці, датычнасці да забойства С. М. Кірава. Па справе былі прыцягнуты 16 чалавек, у тым ліку вядомыя камуністы Р. Зіноўеў, Л. Каменеў, Р. Еўдакімаў, І. Бакаеў. Усе падсудныя былі прыгавораны да расстрэлу. На падставе матэрыялаў справы «Аб'яднанага трацкісцка-зіноўеўскага цэнтра» на працягу 1936 года ў Маскве, Ленінградзе, Горкім і іншых гарадах было арыштавана і асуджана яшчэ каля 160 чалавек. Іх абвінавацілі ў тэрарыстычнай дзейнасці, якую яны праводзілі пад непасрэдным кіраўніцтвам названага «цэнтра». Удзельнікі гэтай справы былі рэабілітаваныя ў 1988 годзе.

**1951** год — нарадзілася (вёска Янкі Докшыцкага раёна) Валянціна Маркавец-Бартлова, мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Аўтарка манументальнага габелена «Белавежская пушча», серыі «Вытокі», сцэнічных касцюмаў для ансамбляў «Песняры», «Харошкі». Лаўрэатка Дзяржаўнай прэміі.

**1991** год — на сесіі Вярхоўнага Савета РСФСР прэзідэнт СССР М.С. Гарбачоў звярнуўся з прапановай аб самароспуску КПСС і заявіў аб складанні ім паўнамоцтваў Генеральнага сакратара ЦК КПСС.

### Было сказана

**Янка СІПАКОЎ, паэт, празаік, публіцыст:**

*«Калі ёсць тупік, трэба,*
*каб і сцежка ад яго нарадзілася».*

## Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

***Ёсць сведчанні, што ў еўрапейскіх краінах аб існаванні дыні і яе незабыўным смаку даведаліся толькі ў эпоху Сярэднявечча.***

# А ВАМ ЯКУЮ ДЫНЮ?

**Радзімай дыні, якая адносіцца да сямейства гарбузовых, лічыцца Азія. Тут, ва ўмовах гарачага лета, ад Сярэдняй Азіі і да трапічных абласцей Індыі выспявае найбольшая колькасць існуючых у свеце культурных і дзікарослых відаў гэтай расліны. Сапраўдным жа цэнтрам зараджэння дыні як сельскагаспадарчай бахчавай культуры з'яўляецца Сярэднеазіяцкі рэгіён, Афганістан, Іран, Кітай і Індыя.**

Сучасныя культурныя формы кардынальна адрозніваюцца ад дзікарослых відаў, якія растуць і па гэты дзень. Дыні робяцца ўсё больш буйнымі і салодкімі.

### СЯРЭДНЕАЗІЯЦКІЯ

Такой разнастайнасці формаў і відаў дынь, як ва Узбекістане, Таджыкістане і іншых дзяржавах рэгіёна, няма нідзе ў свеце. Тут бахчаводам удалося атрымаць не толькі самыя буйнаплодныя, да 25 кг вагой, але і самыя смачныя дыні.

Пры гэтым форма пладоў можа быць ад плоскатай і шарападобнай да падоўжана-эліпсоіднай. Здзіўляе і палітра фарбаў на гладкай або ўзорыстай, з дробнымі расколінамі, лупіне.

Сярод сярэднеазіяцкіх сартоў ёсць дыні гадавага паспявання, якія гатовыя да ўжывання адразу пасля збору з плецяў, а ёсць такія, што ў свежым выглядзе захоўваюцца не менш за 5-6 месяцаў і праяўляюць свае найлепшыя якасці толькі вясной наступнага года. Дыні сорту **Касаба** яшчэ называюць зімовымі, паколькі іх выспяванне пачынаецца вельмі позна. Пасля збору плады аплятаюць чаротам і вешаюць у сухіх памяшканнях або пад навесамі для вытрымкі і захоўвання. Толькі к сакавіку цвёрдая зялёная мякаць становіцца сакавітай і салодкай.

**Дыня Чогары**, або, як часцей яе называюць у рускамоўных рэгіёнах, Бухарка, валодае тоўстай белай, вельмі салодкай мякаццю і дае авальныя, з трохі завостраным канцом плады вагой да 6 кг. Праз высокую сакавітасць гэтыя дыні рэдка можна сустрэць у месцах, далёкіх ад Сярэдняй Азіі, затое тут сорт запатрабаваны і шырока распаўсюджаны.

Затое **дыня Гулябі** добра вядомая на тэрыторыі былога СССР. Гэты сорт адрозніваецца шчыльнай белай мякаццю, саладосцю, добрай лёжкасцю і транспартабельнасцю.

**Дыня Тарпеда** адносіцца да сартоў позняга тэрміну паспявання; яе буйныя даўгаватыя плады дзякуючы форме, за якую расліна і атрымала сваю назву, добра пераносяць транспартаванне.

Ва Узбекістане, адкуль родам гэты сорт, які налічвае ўжо не менш за тры стагоддзі гісторыі, яго называюць мірзачульскай дыняй.

У спелых пладоў афарбоўка пакрытай тонкай сеткай расколін лупіна становіцца пяшчотна-жоўтай з ружовым адценнем, мякаць набывае вытанчаны водар, вылучаецца саладосцю і сакавітасцю.

### ЕЎРАПЕЙСКІЯ

Асаблівай папулярнасцю на Усходзе карыстаюцца ранняспелыя дыні Хандалякі, якія сваёй круглявай формай і невялікімі памерамі вельмі нагадваюць, бадай, самы вядомы ў нас сорт дыні — **Калгасніца**. Гэта невялікія, масай да 2 кг, плады з белай або жоўтай мякаццю, нават у няпростых кліматычных умовах набіраюць добрую колькасць цукру. Мускусная дыня родам з Афганістана або Ірана, воляю лёсу праз Арменію і Турцыю трапіла ў Еўропу, а дакладней, да стала кіраўніка каталіцкай царквы. Смак схаванай пад тоўстай лупінай яркай мякаці дыні Канталупы так прыйшоўся даспадобы Папе Рымскаму, што іх з тых часоў называюць у гонар папскага маёнтка ў Канталупы-ін-Сабіна, дзе была разбіта цэлая дынная плантацыя.

**Дыня Канталупы** мае авальную або трохі плоскатую форму і пакрыта густой сеткай бялявых расколін. Гэта радніць Канталупы з дыняй сорту Эфіопка. Але калі ў «папскай дыні» мякаць насычнага аранжавага адцення, то ў дыні **Эфіопка** мякаць белая, вельмі сакавітая і салодкая.

**Бананавая дыня**, якая набірае на Захадзе папулярнасць, (падоўжаная разнавіднасць Канталупы), вырастае да 80 см у даўжыню, валодае цудоўным смакам і водарам. Прычым плод не толькі нагадвае банан па форме і колеру мякаці, але і смак дыні такі ж мяккі.



Найбліжэйшым сваяком гэтага незвычайнага сорту з'яўляецца дыня Серабрыстая, або **Армянскі агурок**, якая мае агульныя з Канталупы карані, але так непадобная да звыклых пладоў дыні.

Ад культурнай дыні ў спелага плода, даўжынёй да 70 см і вагой да 8 кг, застаўся толькі дынны водар, а ўжываюць у ежу «армянскі агурок» яшчэ зялёным. Прычым расліна адрозніваецца крайняй непатрабавальнасцю да ўмоў вырошчвання і пладаносіць да замаразкаў.

### ЭКЗАТЫЧНЫЯ

З шэрагу суродзічаў **в'етнамская дыня** вылучаецца яркім узорам з светла-жоўтых і карычневых палос, якія чаргуюцца. Аднак нездарма гэтую разнавіднасць з В'етнама называюць Ананаснай дыняй. У яе вельмі добры смак, моцны характэрны водар і мяккая прыемная мякаць. Многія параўноўваюць гэты сорт са славутымі сярэднеазіяцкімі дынямі, вось толькі вага в'етнамскіх дынь ледзь дацягвае да 250 грамаў.

**Мелатрыя шурпатая**, або **Мышыная дыня** з Мальдыўскіх астравоў, прэтэндуе на званне самай мініяцюрнай прадстаўніцы роду. На радзіме дзікарослыя расліны з'яўляюцца шматгадовымі ліянамі. У Еўропе і ЗША ў апошні час культуру часта называюць карлікавым кавуном і пад такой назвай сорт вырошчваецца ў пакаёвых умовах і ў закрытым грунце. Плады ядомыя, але не салодкія, а валодаюць кіслявым асвяжальным смакам і прыдатныя для кансервацыі і ўжывання ў свежым выглядзе.

**Ківана**, яшчэ адна экзатычная культура, якая адносіцца да дынь, у Еўропу трапіла з Афрыкі. Травяністую ліяну, якая дае жоўтыя ці аранжавыя плады даўжынёй да 12-15 см, нездарма называюць **«рагатай дыняй»**, паколькі яркія ягады ўпрыгожваюць канічныя мяккія шыпы.

У адрозненне ад звыклых сартоў дыні, дзе ядомай часткай з'яўляецца мякаць, у Ківана ядуць асяродак зеленаватага колеру, дзе знаходзіцца шматлікае белае або светла-зялёнае насенне. Салодкую сакавітую, падобную на асвяжальнае жэле мякаць «рагатай дыні» можна ўжываць як у свежым выглядзе, так і выкарыстаць для прыгатавання варэнняў, марынадаў і саленняў.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 6.06 | 20.16 | 14.10 |
| Віцебск | 5.53 | 20.08 | 14.15 |
| Магілёў | 5.56 | 20.06 | 14.10 |
| Гомель | 5.56 | 19.59 | 14.03 |
| Гродна | 6.21 | 20.30 | 14.09 |
| Брэст | 6.26 | 20.27 | 14.01 |

**Месяц**

*Поўня 18.08—24.08*
*Месяц у сузор'і Шалі.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандра, Васіля, Максіма, Фёдара.*
***К.*** *Мальвіны, Міхаліны, Юрыя.*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Вечарам забыўся зачыніць акно. У выніку ноч ператварылася ў спецаперацыю па знішчэнні камароў. Вынік аперацыі: дваццаць забітых, трое параненых, у тым ліку адзін цывільны — у цемры на ката наступіў.**

Калі ў вас з'яўляюцца грошы — у вас з'яўляюцца жанчыны.

З'яўляюцца жанчыны — знікаюць грошы.

Знікаюць грошы — знікаюць жанчыны.

Знікаюць жанчыны — з'яўляюцца грошы...

Калі вы зможаце з гэтага замкнёнага кола прыбраць жанчын — вы будзеце казачна багатыя!

**50 грамаў каньяку паляпшаюць здароўе. Вось так сантэхнік Пятроў ужо 15 гадоў прыходзіць дадому ў 10 разоў здаравейшы!**

Малюнак Аркадзія ГУРСКАГА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснікі галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3309.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 23 жніўня 2016 года.